773.161 (С 47.60)
П 16

П. К. ПАНАМАРЭНКА

# АБ АДНАЎЛЕННІ ПАСЕЎНЫХ ПЛОШЧАЎ І ПАВЫШЭННІ ЎРАДЖАЙНАСЦІ Ў КАЛГАСАХ БЕЛАРУСІ

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК 1950

333.161(С47.60) 8814/3
П/6 Пономарэнка
Аб аднаўленні пасеўных плошчаў і павышэнні ўраджайнасці ў Зах. Бел.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Зв.161 (С 47.60)
П 16

П. К. ПАНАМАРЭНКА

# Аб аднаўленні пасеўных плошчаў і павышэнні ўраджайнасці ў калгасах Беларусі

*Скарочаная стэнаграма даклада на рэспубліканскай партыйнай нарадзе 25 лютага 1946 г.*

*Трэцяе выданне*

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Інв. № 8814/3
Президентская библиотека Республики Беларусь
8 800000 927862

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
Мінск 1950

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Інв.
1934 г.

Совецкі народ пасля перамогі над гітлераўскай Германіяй і Японіяй перайшоў да мірнай творчай працы, да ліквідацыі вынікаў нямецка-фашысцкай акупацыі, да аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі.

Таварыш Сталін у сваёй прамове перад выбаршчыкамі Сталінскай выбарчай акругі гор. Масквы 9 лютага 1946 г. начартаў праграму далейшага росту магутнасці совецкай дзяржавы і павышэння жыццёвага ўзроўню працоўных. Гэтая прамова знайшла гарачы водгук і выклікала новы творчы ўздым ва ўсім нашым народзе. Адзінадушным галасаваннем за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных совецкі народ прадэманстраваў сваё адабрэнне палітыкі комуністычнай партыі і сваю рашымасць ператварыць у жыццё сталінскія праднachартанні. (Апладысменты.)

Разам з усім совецкім народам беларускі народ каваў магутнасць нашай Радзімы ў гады сталінскіх пяцігодак. У суровыя дні вайны беларускі народ прадэманстраваў нябачанае ў гісторыі адзінства, высокае ўсведамленне агульнанародных інтарэсаў і ўнёс вялікі ўклад у справу перамогі над ворагам.

Цяпер сталінскія планы адкрываюць перад усёй нашай краінай, перад Совецкай Беларуссю шляхі аднаўлення народнай гаспадаркі, разбуранай захопнікамі, і перспектывы далейшага яе росту і працвітання.

З прычыны велізарнейшых і паўсямесных разбурэнняў, учыненых нямецкімі фашыстамі ў народнай гаспадарцы Беларусі, аднаўленчыя работы ў нас павінны мець велізарны маштаб, а праца—вялікае напружанне.

Няма сумнення, што пры той дапамозе, якую штодзённа аказвае Беларусі Саюзны ўрад і асабіста таварыш Сталін, мы хутка адновім народную гаспадарку Беларусі і створым нармальныя ўмовы жыцця для насельніцтва.

Перад намі велізарны аб'ём аднаўленчых работ ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Нельга раскідвацца, распыляць намаганні. Нам неабходна знайсці галоўныя пытанні аднаў-

ленчых работ, каб, канцэнтравана вырашаючы іх, весці паспяхова рэспубліку па шляху адраджэння і далейшага развіцця ўсёй гаспадаркі.

Нам неабходна знайсці шляхі хутчэйшага і рацыянальнага вырашэння галоўных пытанняў, узброіць кадры правільнай метадалогіяй аднаўлення.

Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі склікаў рэспубліканскую партыйную нараду з удзелам абласных і раённых партыйных і совецкіх кіраўнікоў, зямельных работнікаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі, дзеячоў навукі для таго, каб намеціць і абмеркаваць практычныя шляхі хутчэйшага аднаўлення сельскай гаспадаркі і павышэння ўраджайнасці ў калгасах БССР.

## СТАНОВІШЧА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСІ ДА СОВЕЦКАЙ УЛАДЫ

Да рэволюцыі беларускае сялянства знаходзілася пад жорсткім палітычным, эканамічным і нацыянальным гнётам царызма. Яно бязлітасна эксплаатавалася і прыгняталася рускімі, польскімі і беларускімі памешчыкамі і капіталістамі. Беларускае сялянства ў сваёй большасці было пазбаўлена зямлі.

У дарэволюцыйнай Беларусі 4.000 памешчыкаў уладалі 66,5 процанта ўсёй зямлі, а 664.000 сялянскіх двароў мелі толькі 33,5 процанта і прытым горшай зямлі. Пяць магнатаў—Вітгенштэйн, граф Тышкевіч, граф Патоцкі, князь Радзівіл, княгіня Гогенлоэ ўладалі больш чым двума мільёнамі дзесяцін беларускіх зямель.

Беззямелле і малазямелле, непасільныя падаткі і зверская эксплаатацыя з боку памешчыкаў і кулакоў абумовілі экстэнсіўнасць сялянскай сельскай гаспадаркі і асудзілі беларускае сялянства на галечу.

Селяніну Беларусі заўсёды нехапала зямлі, часта нехапала насення, нехапала коней, інвентару, а многім гаспадаркам нехапала ўсяго разам.

Памешчыкі ўладалі добрымі землямі, мелі аграномаў, сельскагаспадарчыя машыны і гной ад шматлікай жывёлы, атрымлівалі добрыя ўраджаі і ператваралі гэта ў дадатковы сродак закабалення шырокіх мас сялянства. Пераважнай большасці сялян ніколі нехапала свайго хлеба да новага ўраджаю. Лебяда і мякіна былі звычайным прыдаткам да хлеба. У неўраджайныя годы ад голаду вымíралі цэлыя раёны.

«Селянін,—пісаў Ленін,—быў даведзен да жабрацкага ўзроўню жыцця: ён змяшчаўся разам з жывёлай, адзяваўся ў лахманы, харчаваўся лебядой. Сяляне галадалі хранічна і дзесяткамі тысяч паміралі з голаду і эпідэмій у часе неўраджаяў, якія вярталіся ўсё часцей і часцей».

Згодна даных, прыведзеных В. І. Леніным у яго кнізе «Развіццё капіталізма ў Расіі», у Беларусі сялянства было найбольш бедным і прыгнечаным. Працэс дыферэнцыяцыі і разарэння праходзіў тут інтэнсіўней, чым у іншых губернях Расіі. У Беларусі бяднейшая частка сялянскіх гаспадарак (бясконныя і з адным канём) у 1888 годзе складала 57,1 процанта пры 55,8 процанта ў Расіі, у 1900 г.—61,9 пры 59,5 процанта ў Расіі.

Мінская губерня па колькасці сялян, якія, зусім разарыўшыся, пайшлі ў батракі да кулакоў і памешчыкаў, займала першае месца ў дарэвалюцыйнай Расіі.

Працоўнае беларускае сялянства гібела ў галечы, цемры і голадзе. Яно было пагалоўна непісьменным. Армія жабракоў, калек і цяжка хворых запаўняла беларускія вёскі. Згодна перапісу 1897 года, толькі ў Магілёўскай губерні налічвалася 1.078 чалавек сляпых ад нараджэння і 4.000 аслепшых пры жыцці. Балотная ліхаманка, каўтун і трахома з'яўляліся пастаяннымі спадарожнікамі вясковага жыцця.

Малазямелле, нізкія ўраджаі, непасільныя падаткі накладвалі адбітак на ўсю Беларусь, на ўсе бакі народнага жыцця—на жыллё, на быт людзей, іх здароўе, культуру, пісьменнасць.

Сяляне тысячамі вымушаны былі ўцякаць ад галечы з Беларусі. Падлічана, што за 50 год да рэвалюцыі з Беларусі разышліся па ўсяму свету ў пошуках лепшай долі больш 1.387 тысяч чалавек, не лічачы пайшоўшых з імі дзяцей.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Увесь эпас народа, яго фальклор, казкі, быліны, пагаворкі запоўнены матывамі народнага гора.

Беларускія сяляне сваё становішча добра выказалі пагаворкай: «Была ў ваўка адна песня, ды і тую бядняк пераняў».

## РАЗВІЦЦЁ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСІ ПРЫ СОВЕЦКАЙ УЛАДЗЕ

У выніку перамогі Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі Беларусь атрымала сваю дзяржаўнасць. Быў ліквідаваны палітычны, эканамічны і нацыянальны гнёт.

Беларускае сялянства атрымала мільёны дзесяцін зямлі, якая належала памешчыкам і буржуазіі, вызвалілася ад арэндных плацяжоў памешчыкам, якія вылічваліся мільёнамі рублёў штогодна, пазбавілася ад пастаяннай пагрозы страціць кавалак арандаванай або купленай зямлі, атрымала права карыстання прыроднымі багаццямі зямлі, перайшоўшымі ва ўласнасць народа.

Пачалася эпоха палітычнага, культурнага, нацыянальнага развіцця народа і росту яго матэрыяльнага добрабыту.

Адмена прыватнай уласнасці на зямлю і пераразмеркаванне зямлі ў інтарэсах бядняцка-серадняцкіх мас паскорылі аднаўленне сельскай гаспадаркі і ўздым матэрыяльнага ўзроўню працоўных мас вёскі.

У выніку стварэння калгаснага ладу—аднаго з найвялікшых заваяванняў совецкага народа—сялянства назаўсёды вызвалілася ад кулацкай эксплаатацыі і кабалы.

Суцэльная калектывізацыя і ліквідацыя кулацтва, як класа, азначалі пераход усіх зямель у рукі калгасаў. У калгасы, апрача зямельных надзелаў саміх сялян-аднаасобнікаў, уступіўшых у калгас, перайшлі землі кулакоў.

Пераходам гэтай зямлі ў рукі калгасаў і замацаваннем зямлі за кожным калгасам дзяржаўным актам на вечнае карыстанне падведзен вынік шматвяковай барацьбы беларускіх сялян за зямлю.

Індустрыялізацыя краіны дала магчымасць стварыць у соцыялістычным земляробстве высокую механізаваную базу.

У БССР было арганізавана 337 дзяржаўных машынна-трактарных станцый. На калгасных палях у 1940 годзе працавалі тысячы трактараў агульнай магутнасцю ў 392,1 тысячы конскіх сіл, што ў агульным балансе цягла калгасаў складала 57,9 процанта.

Калгасная сельская гаспадарка мела 1.592 камбайны, 2.300 складаных малатарань, 9.200 культыватараў і многія другія глебаапрацоўчыя і ўборачныя машыны.

Ліквідацыя цераспалосіцы і рацыянальнае землеўпарадкаванне павялічылі зямельныя рэсурсы, палепшылі зямельную гаспадарку, стварылі магчымасць прымянення машыннай тэхнікі, магчымасць вядзення гаспадаркі на высокай агратэхнічнай аснове.

Пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б), Саюзнага ўрада і асабіста таварыша Сталіна, пры брацкай дапамозе рускага народа і

другіх народаў Совецкага Саюза, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі Беларусі калгасы рэспублікі правялі такія буйнейшыя мерапрыемствы ў сельскай гаспадарцы, як укараненне навейшай агратэхнікі, паўсямеснае ўвядзенне правільных севазваротаў, ссяленне хутароў, асушэнне соцень тысяч гектараў балотных зямель і ператварэнне іх у высокаўраджайныя нівы.

Калгасы разбілі рэакцыйную «тэорыю», якая ўкаранілася ў свой час, «аб дрэннай зямлі ў Беларусі». З кожным годам усё большы і большы лік калгасаў дабіваўся высокіх ураджаяў збожжавых, тэхнічных, гароднінных і іншых культур.

У Беларусі паявіліся калгасы, якія давалі рэкордныя для Совецкага Саюза ўраджаі, паявіліся першыя калгасы-мільянеры.

У рэспубліцы ўраджай збожжавых звыш 10,1 цэнтнера з гектара мелі:

у 1938 годзе — 515 калгасаў, або 5,3 процанта калгасаў;
у 1939 годзе — 1651 калгас, або 17,1 процанта калгасаў;
у 1940 годзе — 2738 калгасаў, або 28,4 процанта калгасаў.

З іх:

| | | |
|---|---|---|
| ад 10 да 12 | цэнтнераў з гектара атрымалі | 1.730 калгасаў; |
| » 12 — 14 | » » » » | 620 калгасаў; |
| » 14 — 16 | » » » » | 241 калгас; |
| » 16 — 19 | » » » » | 59 калгасаў; |
| звыш 20 | » » » » | 33 калгасы. |

Больш 2000 калгасаў набліжаліся да гэтых ураджаяў.

Сельская гаспадарка Беларусі, якая прагрэсіравала з такім поспехам, давала штогод буйны прырост прадукцыі. З 1938 па 1941 год збор збожжавых у калгасах БССР вырас на 44 млн. пудоў.

Прымяненне ў калгасах трактараў і іншых сучасных сельскагаспадарчых машын, вядзенне гаспадаркі па плану, прымяненне сучаснай агранамічнай навукі аблягчылі працу селяніна і зрабілі яе больш прадукцыйнай у параўнанні з аднаасобнай гаспадаркай.

Прадукцыйнасць калгаснай сельскай гаспадаркі і калектыўнай працы калгаснікаў ярка ілюструецца супастаўленнем даных валавога збору сельскагаспадарчых прадуктаў і затрат працы за 1913 і 1940 гг.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

| | 1913 г. аднаасоб. гасп-кі | 1940 г. калгасы | 1940 г. у % да 1913 г. |
|---|---|---|---|
| Валавы збор збожжавых і бульбы ў пераводзе на збожжа (у млн. пуд.) | 123,20 | 168,3 | 136,7 |
| Лік круглагадовых рабочых у вытворчасці (у млн. чал.) | 1,270 | 0,792 | 62,3 |
| Прыпадала на 1 круглагадовага рабочага ў пераводзе на збожжа ў пудах | 97,3 | 211,0 | 217,0 |

Такім чынам, пры затраце калгасамі БССР у 1940 годзе 62,3 процанта ліку круглагадовых рабочых у адносінах да 1913 года, валавы аб'ём прадукцыі быў на 37 працантаў больш, а выпрацоўка прадукцыі на аднаго круглагадовага рабочага ў 1940 годзе ў параўнанні з выпрацоўкай на аднаго круглагадовага рабочага ў 1913 годзе складае 217 працантаў.

Значыцца, прадукцыйнасць сельскай гаспадаркі калгасаў у 1940 годзе, у параўнанні з аднаасобнымі гаспадаркамі ў 1913 годзе, больш чым падвоілася.

Аднак прадукцыйнасць калгаснай гаспадаркі яшчэ вышэйшая, калі ўлічыць тэхнічныя культуры, якія выраслі ў некалькі разоў у параўнанні з 1913 годам, а таксама даходы ад грамадскай жывёлагадоўлі і іншых галін калгаснай гаспадаркі.

Разам з ростам прадукцыйнасці калгаснай гаспадаркі раслі і даходы калгасаў і калгаснікаў. Калі размеркаваную прадукцыю калгасаў за 1938 год прыняць за 100 працантаў, то размеркаванне даходаў за наступныя гады ў працантах склала:

| | 1938 г. | 1939 г. | 1940 г. |
|---|---|---|---|
| Атрымана на працадні збожжавых на адну калгасную сям'ю | 100 | 122 | 111 |
| Атрымана бульбы на адну калгасную сям'ю | 100 | 66 | 153 |
| Прадана збожжа на калгасных рынках | 100 | 182 | 349 |
| Адлічана ў недатыкальныя фонды | 100 | 102 | 121,5 |

Такім чынам, калгасная гаспадарка Беларусі ў перадваенныя гады характарызуецца штогодным павелічэннем ураджаяў, значным ростам прадукцыі калгасаў, ростам даходаў калгаснікаў, расшырэннем расходаў на будаўніцтва ў калгасах і затрат на расшырэнне калгаснай вытворчасці і павелічэннем прадукцыі, рэалізуемай на калгасных рынках.

У беларускай вёсцы адбыўся сапраўдны росквіт матэрыяльнага і культурнага жыцця. У краіне, дзе да рэвалюцыі

| | 1913 г. аднаасоб. гасп-кі | 1940 г. калгасы | 1940 г. у % да 1913 г. |
|---|---|---|---|
| Валавы збор збожжавых і бульбы ў пераводзе на збожжа (у млн. пуд.) | 123,20 | 168,3 | 136,7 |
| Лік круглагадовых рабочых у вытворчасці (у млн. чал.) | 1,270 | 0,792 | 62,3 |
| Прыпадала на 1 круглагадовага рабочага ў пераводзе на збожжа ў пудах | 97,3 | 211,0 | 217,0 |

Такім чынам, пры затраце калгасамі БССР у 1940 годзе 62,3 процанта ліку круглагадовых рабочых у адносінах да 1913 года, валавы аб'ём прадукцыі быў на 37 працантаў больш, а выпрацоўка прадукцыі на аднаго круглагадовага рабочага ў 1940 годзе ў параўнанні з выпрацоўкай на аднаго круглагадовага рабочага ў 1913 годзе складае 217 працантаў.

Значыцца, прадукцыйнасць сельскай гаспадаркі калгасаў у 1940 годзе, у параўнанні з аднаасобнымі гаспадаркамі ў 1913 годзе, больш чым падвоілася.

Аднак прадукцыйнасць калгаснай гаспадаркі яшчэ вышэйшая, калі ўлічыць тэхнічныя культуры, якія выраслі ў некалькі разоў у параўнанні з 1913 годам, а таксама даходы ад грамадскай жывёлагадоўлі і іншых галін калгаснай гаспадаркі.

Разам з ростам прадукцыйнасці калгаснай гаспадаркі раслі і даходы калгасаў і калгаснікаў. Калі размеркаваную прадукцыю калгасаў за 1938 год прыняць за 100 працантаў, то размеркаванне даходаў за наступныя гады ў працантах склала:

| | 1938 г. | 1939 г. | 1940 г. |
|---|---|---|---|
| Атрымана на працадні збожжавых на адну калгасную сям'ю | 100 | 122 | 111 |
| Атрымана бульбы на адну калгасную сям'ю | 100 | 66 | 153 |
| Прадана збожжа на калгасных рынках | 100 | 182 | 349 |
| Адлічана ў недатыкальныя фонды | 100 | 102 | 121,5 |

Такім чынам, калгасная гаспадарка Беларусі ў перадваенныя гады характарызуецца штогодным павелічэннем ураджаяў, значным ростам прадукцыі калгасаў, ростам даходаў калгаснікаў, расшырэннем расходаў на будаўніцтва ў калгасах і затрат на расшырэнне калгаснай вытворчасці і павелічэннем прадукцыі, рэалізуемай на калгасных рынках.

У беларускай вёсцы адбыўся сапраўдны росквіт матэрыяльнага і культурнага жыцця. У краіне, дзе да рэвалюцыі



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

дзве трэці насельніцтва былі непісьменныя, поўнасцю ліквідавана непісьменнасць—векавое зло народа. За 10 гадоў, з 1929 па 1939 год, расходы на народную асвету на душу насельніцтва ўзраслі ў 15,5 раза, і па ўзроўню народнай асветы Беларусь заняла больш высокае месца, чым самыя перадавыя капіталістычныя краіны.

У 1938—1939 навучальным годзе на 1.000 чалавек насельніцтва прыпадала ў Англіі, напрыклад, 144,9 навучаючыхся агульнаадукацыйнай школы, у Беларусі—208,7 навучаючыхся.

У тым-жа годзе на 1.000 чалавек насельніцтва ў Англіі прыпадала 11,3 навучаючыхся сярэдняй школы, а ў Беларусі—14,6.

Народ, які пастаўляў у мінулым у армію малапісьменных і непісьменных новабранцаў, вырасціў за гады савецкай улады 217 генералаў, дзесяткі тысяч афіцэраў, многа пісьменнікаў, прафесараў, акадэмікаў, кампазітараў, мастакоў, архітэктараў, артыстаў, інжынераў—стварыў сваю савецкую нацыянальную інтэлігенцыю.

У выніку перамогі калгаснага ладу ў вёсцы адбылося разняволенне жанчыны-сялянкі. З прыгнечанай рабыні, цалкам залежаўшай ад мужа, жанчына ператварылася ў свабодную грамадзянку, якая аднолькава забяспечваецца калгасам і мае роўныя правы. Гэта стварыла нармальныя, здаровыя адносіны ў сям'і і ўмацавала сям'ю.

Поспехі ў развіцці калгаснай вытворчасці ў перадваенны перыяд расцэньваліся намі ўсімі, як моцны фундамент далейшага, яшчэ больш хуткага развіцця народнай гаспадаркі.

Магчымасці росту сельскай гаспадаркі, якія былі ў калгасах, далёка не былі вычарпаны, не былі поўнасцю яшчэ ліквідаваны сур'ёзныя недахопы ў калгаснай вытворчасці.

Не гледзячы на вялікія поспехі ў галіне росту прадукцыі на душу насельніцтва, сярэднія ўраджаі і агульны аб'ём прадукцыі ўсё яшчэ не былі здавальняючымі.

У 10—15 процантах калгасаў рэспублікі ўраджаі прадаўжалі заставацца недапушчальна нізкімі, хоць гэтыя калгасы знаходзіліся ў роўных умовах з усімі іншымі. У адстаўшых калгасах былі дрэнныя кіраўнікі, нядружна працавалі калгаснікі, тут не скарыстоўваліся ўсе магчымасці калгаснай вытворчасці.

Комуністычная партыя большэвікоў Беларусі, калгаснікі рэспублікі прадаўжалі працаваць над далейшым палепшаннем і пашырэннем калгаснай вытворчасці, над асваеннем новых

зямель, над далейшым павышэннем культуры земляробства і павышэннем ураджаю. Паказчыкам у гэтай праводзімай рабоце быў добры ўраджай 1941 года, на 20 процантаў вышэйшы за ўраджай 1940 года. Збор гэтага ўраджаю павінен быў яшчэ больш павялічыць даходы калгасаў. Аднак мірная творчая праца беларускага народа, такая выдатная па сваіх выніках, была спынена нападам нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

## РАЗАРЭННЕ КАЛГАСАЎ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМІ ЗАХОПНІКАМІ

Нямецка-фашысцкія захопнікі, акупіраваўшы Беларусь, з асцервяненнем і злобай абрушыліся на калгасны лад. Яны не толькі грабілі сялянскае дабро і разаралі арцельную гаспадарку, будучы носьбітамі самага разбойніцкага імперыялізма і рэакцыі, яны па-зверску расправяліся з калгасным сялянствам, прабуючы зламаць яго свабодалюбівы, рэвалюцыйны дух, падарваць яго веру ў сілу і магутнасць савецкага ладу.

Шляхам самага жорсткага тэрору, страшэннага разбою і грабяжу нямецкія захопнікі прабавалі разбурыць новыя соцыялістычныя адносіны ў вёсцы, узнікшыя ў выніку перамогі калгаснага ладу, абудзіць і распаліць у сялянстве ўласніцкія інстынкты, вытруціць са свядомасці сялянскіх мас самую ідэю свабоднага калгаснага жыцця.

У канчатковым выніку замыслы нямецка-фашысцкіх акупантаў зводзіліся да таго, каб адабраць у савецкага сялянства зямлю і ўсё тое, што далі яму савецкая ўлада і калгасны лад, аднавіць прыгонніцка-памешчыцкі лад іператварыць сялян у пакорных рабоў нямецкіх памешчыкаў.

За час акупацыі фашысцкія захопнікі разарылі калгасы, разграбілі і знішчылі іх маёмасць і матэрыяльна-тэхнічную базу.

Нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі машынна-трактарныя станцыі, спалілі і знішчылі амаль усе грамадскія, вытворчыя пабудовы калгасаў, соўгасаў, МТС, сельскагаспадарчыя навучальныя ўстановы, элеватары і млыны, разграбілі сельскагаспадарчыя машыны і інвентар.

За час акупацыі плошчы пад пасевамі зменшыліся на 60 процантаў, прычым бульбы—у чатыры разы, ільну—ў восем разоў, пасевы канюшыны, кок-сагызу, парнікова-цяплічная

гаспадарка і гародніцтва былі знішчаны захопнікамі амаль поўнасцю.

Акупанты нанеслі велізарныя страты садоўніцтву, знішчылі поўнасцю пчалярства і насенневодства.

Гітлераўскія разбойнікі знішчылі грамадскую жывёлагадоўлю калгасаў, разграбілі маёмасць і жывёлу калгаснікаў. 412 тысяч дамоў калгаснікаў і каля 500 тысяч гаспадарчых збудаванняў было разбурана ўшчэнт. Больш 66 працэнтаў калгаснікаў аказаліся пазбаўленымі жывёлы. К дню вызвалення засталося толькі 25 працэнтаў коней.

Разбурыўшы калгасы, фашысцкія варвары поўнасцю ліквідавалі правільныя севазвароты, якія былі ўведзены да вайны ва ўсіх калгасах і прадстаўлялі сабой велізарнае дасягненне, ствараючы сур'ёзнейшыя прадпасылкі для далейшага развіцця сельскай гаспадаркі.

Асвоеныя ў мінулым 270 тысяч гектараў асушаных балотных высокаўраджайных зямель прышлі ў нягоднасць. Меліяратыўныя збудаванні, якія ствараліся шматгадовай працай беларускага народа, аказаліся таксама разбуранымі.

Такім чынам, сельская гаспадарка рэспублікі падверглася небывалым разбурэнням і к моманту вызвалення БССР аказалася глыбока расстроенай і дэзарганізаванай.

## НЕКАТОРЫЯ ВЫНІКІ АДНАЎЛЕНЧЫХ РАБОТ У СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў калгаснае сялянства з велізарным натхненнем узялося за аднаўленне калгаснай гаспадаркі. Менш чым за два месяцы з дня вызвалення было адноўлена больш 8 тысяч калгасаў. Аднаўленне калгасаў у такі кароткі тэрмін, якое адбывалася пры небывалым палітычным уздыме і лікаванні народа, прадэманстравала велізарную жыццёвасць калгаснага ладу і бязмежную адданасць беларускага народа савецкаму ладу.

У рэспубліцы праведзена значная работа па адраджэнню калгасаў, аднаўленню пасеўных плошчаў, жывёлагадоўлі і іншых галін калгаснай вытворчасці, аднаўленню МТС і МТМ. Многае ўжо зроблена ў галіне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў.

Адноўленыя пасеўныя плошчы ў калгасах складаюць 62,2

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

процанта да даваеннага. У 1945 годзе пасеяна на 780 тысяч гектараў больш, чым у папярэднім.

Значныя поспехі калгасаў у аднаўленні жывёлагадоўлі. У рэспубліцы ўжо ёсць больш 21 тысячы жывёлагадоўчых і птушкагадоўчых ферм. Толькі за 1945 год пагалоўе коней у калгасах павялічылася больш чым на 70 тысяч, буйнай рагатай жывёлы—на 140 тысяч галоў, свіней—на 30 тысяч, авечак—на 87 тысяч галоў.

Паспяхова таксама вырашаецца пытанне ліквідацыі бескароўнасці калгаснікаў. Калі к часу вызвалення Беларусі было кароў у асабістым карыстанні калгаснікаў толькі 280 тысяч галоў, то на 1 студзеня 1946 года было ўжо 462,4 тысячы галоў.

У цяперашніх умовах, пры велізарным недахопе конскага пагалоўя яшчэ больш узрасла роля МТС. Партыйныя, савецкія і зямельныя органы БССР надалі сур'ёзнае значэнне і аказалі МТС вялікую дапамогу ў іх аднаўленні, у рамонце і належным скарыстанні трактарнага парка. У выніку гэтага МТС Беларусі дабіліся ў 1945 годзе вялікіх поспехаў, выканаўшы гадавы план на 112,7 процанта, даўшы найбольшую выпрацоўку на трактар за прайшоўшыя 15 год. Па рамонту трактараў Беларусь чатыры разы выходзіла пераможцам ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве.

Рабочыя, трактарысты, механікі, інжынерна-тэхнічны і кіруючы персанал машынна-трактарных станцый Беларусі паказалі бліскучы ўзор высокай сацыялістычнай прадукцыйнасці працы.

Значныя поспехі дасягнуты ў справе будаўніцтва і аднаўлення дамоў калгаснікаў, будынкаў грамадскіх і культурных устаноў.

Адноўлена і пабудавана больш 218.000 дамоў і перaселена з зямлянак больш 200.000 сем'яў.

Велізарную дапамогу аказаў сельскай гаспадарцы Беларусі Саюзны ўрад. За 1945 год завезена ў калгасы рэспублікі звыш 15 тысяч розных сельскагаспадарчых машын і прылад, у тым ліку каля 900 трактарных малатарань. Атрымана 70 тысяч коней, 109 тысяч кароў, 417 трактараў, больш 3.000 аўтамашын для сельскай гаспадаркі.

Пад ураджай 1945 года калгасам была адпушчана насенная пазыка: збожжавых—15.000 тон, ільнонасення—2.136 тон, бульбы—22.000 тон.

Не гледзячы на вялікую работу, праведзеную ў сельскай гаспадарцы, і вялікую дапамогу, аказаную нам Саюзным

урадам, цяжкія вынікі нямецкай акупацыі не маглі не адбіцца на выніках 1945 сельскагаспадарчага года. Ураджай збожжавых і бульбы па рэспубліцы быў атрыман нізкі.

У сувязі з гэтым намнога знізіліся даходы калгаснікаў у параўнанні з 1940 годам.

Недастатковы ўраджай у 1945 годзе ў Беларусі цалкам з'яўляецца вынікам трохгадовай нямецкай акупацыі, у выніку якой разбурана сельская гаспадарка. На ўраджай гэтага года аказалі ўплыў наступныя фактары:

а) спусташэнне, запусценне і засмечанне зямель, якія пadрапежніцку эксплаатаваліся пры нямецкай акупацыі;

б) знішчэнне правільных севазваротаў і пасеваў шматгадовых траў;

в) надзвычай малая колькасць унесеных пад ураджай 1945 года ўгнаенняў. У глебу было ўнесена толькі 2,5 мільёна тон гною, або каля 12,5 процанта ў параўнанні з 1940 годам;

г) недахоп цягла і адсутнасць дастатковай колькасці культурных глебаапрацоўчых машын. У выніку гэтага ўзровень апрацоўкі палёў значна знізіўся. Пад ураджай 1945 года калгаснікі апрацавалі да 170 тысяч гектараў прымітыўным спосабам—ускапалі ўручную;

д) зрыў у многіх выпадках правядзення сельскагаспадарчых работ у лепшыя агратэхнічныя тэрміны з прычыны недахопу цягла, механізацыі, а ў радзе месц і з-за дрэннай працоўнай дысцыпліны.

Вынікі 1945 сельскагаспадарчага года прымушаюць задумацца над сур'ёзнымі мерамі, якія неабходна прыняць для таго, каб не толькі падняць ураджайнасць да даваеннага ўзроўню, але і значна перавысіць яе ў бліжэйшыя годы.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## НАРОДНАЯ ГАСПАДАРКА БССР У ЧАЦВЕРТАЙ СТАЛІНСКАЙ ПЯЦІГОДЦЫ

Таварыш Сталін паставіў перад намі задачу: «У раёнах, дзе часова гаспадарылі фашысцкія пагромшчыкі, нам прадстаіць аднавіць разбураныя гарады і сёлы, прамысловасць, транспарт, сельскую гаспадарку, культурныя ўстановы, стварыць для савецкіх людзей, вызваленых ад фашысцкага рабства, нармальныя ўмовы жыцця. Ужо цяпер поўным ходам разгарнулася работа па аднаўленню гаспадаркі і культуры ў вызваленых ад ворага раёнах. Але гэта толькі пачатак.

Нам неабходна поўнасцю ліквідаваць вынікі гаспадарання немцаў у раёнах, вызваленых ад нямецкай акупацыі. Гэта вялікая, агульнанародная задача. Мы можам і павінны вырашыць гэтую цяжкую задачу ў кароткі тэрмін».

Вядома, што да вайны Беларусь, пры дапамозе Саюзнага ўрада, пры асобых і непасрэдных клопатах таварыша Сталіна, вырасла ў перадавую ў эканамічных і культурных адносінах рэспубліку, ліквідавала атрыманую ў спадчыну эканамічную, соцыяльную і культурную векавую адсталасць, перавяла гаспадарку рэспублікі на шлях сучаснай індустрыі і соцыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Соцыялістычная сістэма вытворчасці безраздзельна панавала ў народнай гаспадарцы. Удзельная вага прамысловасці складала 80 процантаў ад прадукцыі ўсёй народнай гаспадаркі. Валавая прадукцыя ўзрасла ў 1940 годзе ў параўнанні з 1913 годам у 23 разы. Вытворчасць электраэнергіі павялічылася ў 120 разоў. Многія галіны прамысловасці Беларусі набылі сур'ёзнае значэнне ў агульным балансе прамысловай вытворчасці Саюза.

36 ВНУ, 159 тэхнікумаў, 13.043 школы, 3.716 бібліятэк, Акадэмія навук, 54 навукова-даследчыя інстытуты і ўстановы, 23 тэатры, клубы, кінотэатры, музеі — яркія паказальнікі росквіту навукі, культуры і мастацтва Беларусі за гады совецкай улады.

Закон аб пяцігадовым плане, прыняты Сесіяй Вярхоўнага Совета Саюза ССР, вызначыў агульны аб'ём капітальных работ на чацвертую пяцігодку па Беларусі ў 6.950 млн. рублёў. Гэта значна перавышае асігнаванні першай, другой і трэцяй пяцігодак, разам узятых. Такі аб'ём капітальных работ вызначае магутную праграму будаўніцтва ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Пяцігадовы план на 1946 — 1950 гг. па Беларусі прадугледжвае ліквідацыю вынікаў вайны і аднаўленне разбуранай гаспадаркі рэспублікі з такім разлікам, каб перавысіць аб'ём прамысловай вытворчасці ў 1950 годзе, у параўнанні з даваенным узроўнем, на 16%.

Пяцігадовы план прадугледжвае стварэнне магутнай энергетычнай базы ў Беларусі. За гады пяцігодкі павінна быць уведзена 243 тыс. кіловат электрычных магутнасцей, што з улікам тых магутнасцей, якія ўжо аднаўлены, складзе звыш 300 тыс. кіловат, г. зн. у 2,5 раза перавысіць усю ўстаноўленую магутнасць электрастанцый к пачатку вайны. Такая магутнасць забяспечыць патрэбы народнай гаспадаркі рэс-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

публікі, і энергетычная база будзе мець неабходны рэзерв для далейшага развіцця галін народнай гаспадаркі.

Агульная выпрацоўка электраэнергіі на канец пяцігодкі вызначана ў 650 млн. кіловат-гадзін.

У галіне развіцця мясцовай паліўнай прамысловасці ставіцца задача давесці здабычу торфу ў 1950 годзе да 4.162 тысяч тон, супроць 3.280 тысяч тон даваеннай здабычы. Такі аб'ём торфаздабычы мае на ўвазе ўкараненне перадавых спосабаў торфаздабычы і комплексную механізацыю ўсіх працэсаў і работ, звязаных са здабываннем і транспартыроўкай торфу, што асабліва важна, улічваючы працаёмкасць тарфяной прамысловасці і абмежаванасць працоўных рэсурсаў.

У справе паспяховага аднаўлення ўсёй народнай гаспадаркі Беларусі вялікія задачы стаяць перад нашай машынабудаўнічай і станкабудаўнічай прамысловасцю. Вытворчасць станкоў павінна дасягнуць у 1950 годзе 4.500 адзінак.

У рэспубліцы ствараюцца новыя галіны машынабудаўніцтва, як трактарны завод, аўтамабільны завод, заводы сельгасмашынабудаўніцтва. Поўнасцю аднаўляюцца металаапрацоўчыя, станкабудаўнічыя заводы. Ствараецца новы завод заточных станкоў.

Па лініі мясцовай прамысловасці будуць пабудаваны і ўведзены ў эксплаатацыю 4 станказаводы, магутнасцю 1150 станкоў у год.

Грандыёзныя задачы, якія стаяць перад рэспублікай у галіне аднаўлення народнай гаспадаркі, запатрабуюць вялікай колькасці будаўнічых матэрыялаў і вылучаюць гэтую галіну прамысловасці на адно з перадавых месц, ад работы якой будзе залежаць паспяховае ажыццяўленне і асваенне тых вялікіх асігнаванняў, якія прадугледжаны пяцігадовым планам.

З прычыны гэтага асноўная ўвага ў новай пяцігодцы адводзіцца прамысловасці будматэрыялаў шляхам не толькі аднаўлення ранейшых магутнасцей, але і шырокага будаўніцтва новых заводаў па вытворчасці рознастайных новых відаў будаўнічых матэрыялаў, раней у Беларусі не існаваўшых (керамічная сантэхніка, агнетрывалыя вырабы, фасонная і абліцовачная цэгла, ізаляцыйныя матэрыялы, розныя віды новых дахавых матэрыялаў і т. д.). Аб'ём вытворчасці цэглы ў 1950 годзе будзе даведзен да 1250 млн. штук.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У адпаведнасці з гістарычным рашэннем Соўнаркома Саюза і ЦК ВКП(б) «Аб сельскім і калгасным будаўніцтве ў Беларусі», намячаецца шырокае развіццё вытворчасці будаўнічых матэрыялаў на сяле. Шырока разгорнутая вытворчасць цэглы дазволіць ператварыць яе ў асноўны будаўнічы матэрыял не толькі ў горадзе, але і ў калгаснай вёсцы, дазволіць прыступіць да масавага будаўніцтва з цэглы дамоў калгаснікаў і грамадскіх пабудоў калгасаў, культурна-бытавых будынкаў на сяле і прывесці знадворны выгляд калгаснай вёскі ў Беларусі ў адпаведнасць з багатым духоўным і матэрыяльным жыццём калгасаў.

Каб ліквідаваць сур'ёзнае адставанне Беларускай ССР у галіне вывучэння натуральных выкапняў рэспублікі, у пяцігадовым плане намячаецца арганізацыя буйных геолага-разведачных работ па ўсёй тэрыторыі БССР. Геалагічная разведка мае на мэце завяршыць даследаванне поўдня Беларусі на нафту, вугаль і соль, поўначы Беларусі — на жалезныя руды.

У цеснай сувязі з развіццём прамысловасці будматэрыялаў пастаўлены задачы ў пяцігадовым плане перад лясной прамысловасцю БССР. У Рэчыцы, Мозыры і Віцебску будуць уведзены ў строй тры домабудаўнічых камбінаты, якія ўсе разам узятыя могуць даць да 600 тыс. кв. метраў жылой плошчы ў год.

Пяцігадовы план прадугледжвае шырокую перапрацоўку сельскагаспадарчай сыравіны і тэхнічных культур непасрэдна ў рэспубліцы і скарачэнне вывазу гэтай сыравіны за межы БССР (перапрацоўка ільну, бульбы, шэрсці, буракоў, гародніны).

У сувязі з гэтым шырокае развіццё атрымаюць галіны лёгкай, тэкстыльнай, харчовай і мясамалочнай прамысловасці БССР.

Аб гэтым сведчыць намечаны аб'ём вытворчасці паасобных відаў вырабаў. Так: абутку скуранага павінна быць выраблена ў 1950 годзе 9.460 тысяч пар, што ў 20 разоў перавысіць фактычную вытворчасць абутку ў 1945 годзе. У Беларусі будуць пабудаваны два буйныя тонкасуконныя камбінаты (у Мінску і Гродна), якія павінны забяспечыць у 1950 годзе вытворчасць 1.600 тыс. метраў шарсцяных тканін. Вытворчасць ільняных тканін дасягне 19 млн. метраў супроць 15,7 млн. выробленых у 1940 годзе. Панчошна-насочных вырабаў намячаецца выпусціць у 1950 годзе 35,8 млн. пар.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У Беларусі ствараецца новая галіна харчовай прамысловасці — цукровая. Будзе пабудован новы цукровы завод, і ў 1950 годзе наша рэспубліка атрымае 6 тысяч тон цукру.

На базе адкрытага месцанараджэння солі будзе пабудован саляны завод, які забяспечыць у 1950 годзе вытворчасць 30 тысяч тон солі. Такім чынам ствараецца яшчэ адна галіна харчовай прамысловасці — саляная.

Велізарнае значэнне ў пяцігадовым плане мае найшырэйшая мабілізацыя мясцовых рэсурсаў у народнай гаспадарцы. Пяцігадовы план прадугледжвае меры, стымулюючыя развіццё мясцовай прамысловасці. У нас, у Беларусі, мясцовая прамысловасць павінна заняць віднае месца ва ўсёй прамысловасці рэспублікі; яна павінна быць заклікана да сапраўднага абслугоўвання патрэб аднаўлення народнай гаспадаркі, да максімальнага выпуску прадметаў шырокага спажывання для задавальнення штодзённых патрэб насельніцтва.

Мясцовая прамысловасць павінна з'явіцца сур'ёзнай крыніцай дапамогі ў аднаўленні нашай сельскай гаспадаркі. Для гэтага Міністэрствам мясцовай прамысловасці ствараюцца заводы сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва і заводы, спецыяльна вырабляючыя запасныя часткі для сельгасмашын. Аднаўляецца фасфарытны завод з узбагачальнай установкай.

Не менш пачэсная з'яўляецца задача мясцовай прамысловасці па лініі скарыстання ўсіх унутрырэспубліканскіх рэсурсаў мясцовай сыравіны для вытворчасці прадметаў шырокага спажывання.

Гэта, галоўным чынам, адносіцца да вытворчасці рознастайных прадметаў хатняга ўжытку (нажы, відэльцы, лыжкі, ложкі), розных інструментаў для нашых будаўнічых работ (тапары, лапаты і т. д.), інвентара для калгаснай вёскі (калёсы, сані, абады, дугі) і вытворчасць шырокага асартыменту розных харчовых прадуктаў на базе скарыстання дзікарастучых (ягады, грыбы і т. д.).

Пяцігадовы план прадугледжвае правядзенне буйных мерапрыемстваў у галіне аднаўлення комунальнай гаспадаркі, устаноў культуры, навукі, мастацтва і аховы здароўя.

Комуністычная партыя Беларусі, выконваючы ўказанні таварыша Сталіна, будзе працаваць над аднаўленнем і ажыццяўленнем новага ўздыму прамысловай вытворчасці ў Беларусі, што адыграе важнейшую ролю ў справе аднаўлення, далейшага развіцця і інтэнсіфікацыі нашай сельскай гаспадаркі.

3—94.

88/4/3

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Урадавая бібліятэка імя ГОРКАГА Інв. 27

Пяцігадовы план аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі БССР прадугледжвае поўнае аднаўленне ў калгасах БССР апрацоўваемай пахаці і агульнай плошчы пасеву ў размерах 101,5 процанта да плошчы 1940 года. Значнае развіццё набываюць такія важнейшыя для народнай гаспадаркі культуры, як лён, плошча пад якім дасягне 83 процантаў даваеннай; пасевы кок-сагызу таксама значна ўзрастуць.

Асаблівая ўвага звяртаецца на развіццё кармавых культур, іх удзельная вага ў пасеўных плошчах узрасце з 10,1 процанта ў 1940 годзе да 15,3 процанта ў 1950 годзе.

Сярод кармавых культур важнейшае месца адводзіцца шматгадовым травам. З 435 тысяч гектараў кармавых культур у 1950 годзе 370 тысяч гектараў будзе занята пад шматгадовыя травы. Шматгадовыя травы павінны не толькі забяспечыць размяшчэнне важнейшых тэхнічных культур (ільну і іншых) па найлепшых папярэдніках і поўнае асваенне правільных травапольных севазваротаў, але і стварыць дастатковую кармавую базу для магутнага ўздыму соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

Пяцігадовым планам прадугледжана поўнае аднаўленне пасеўных плошчаў пад бульбай і гароднінными культурамі.

Важнейшай народнагаспадарчай задачай у гэтым пяцігоддзі з'явіцца аднаўленне 270 тысяч гектараў раней асушаных балот, з якіх 75 тысяч гектараў будуць асвоены ў 1946 годзе. Трэба стварыць неабходную базу для ажыццяўлення ў недалёкім будучым грандыёзнай праграмы меліяратыўных работ на плошчы ў 4 мільёны гектараў.

Змены ў структуры пасеўных плошчаў у калгасах, якія намячаюцца пяцігадовым планам, абумовяць далейшую інтэнсіфікацыю сельскай гаспадаркі і значны рост таварнасці калгаснай вытворчасці.

Пяцігадовы план прадугледжвае значны рост ураджайнасці, які к 1950 году ў сярэднім выразіцца: па збожжавых— 10,3 цэнтнера з гектара, па бульбе — 145 цэнтнераў, па ільновалакну—3 цэнтнеры з гектара.

Валавы збор сельскагаспадарчай прадукцыі ў калгасах адпаведна павялічыцца ў параўнанні з 1940 годам: па збожжавых — да 111,5 проц., па бульбе — да 106,2 процанта, па ільнавалакну — да 131,6 процанта.

Павышэнне валавога збору прадукцыі ў калгасах будзе вызначаць значны рост народнага даходу і добрабыту рэспублікі.



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Пяцігадовы план прадугледжвае значны рост жывёлагадоўлі і птушкагадоўлі.

К 1950 году поўнасцю аднаўляецца пагалоўе буйнай рагатай жывёлы як у калгасах, так і агульнае пагалоўе рэспублікі — і будзе даведзена:

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| усёй буйнай рагатай жывёлы | да 100,5% | у адносінах | да 1940 | года |
| буйнай рагатай жывёлы ў калгасах | » 111,2% | » | » | » |
| свіней | » 114,6% | » | » | » |
| авечак і коз | » 117,8% | » | » | » |

Ужо ў 1947 годзе калгасныя сем'і павінны мець у асабістым карыстанні кароў і іншую дробную жывёлу і птушак.

У 1950 годзе ўсё пагалоўе коней у рэспубліцы складзе 76%, у тым ліку ў калгасах 59% у адносінах да 1940 года.

Вялікія работы ў пяцігодцы павінны быць праароблены па поўнаму аднаўленню МТС і іх гаспадарчаму ўпарадкаванню.

Нашай важнейшай задачай з'явіцца аднаўленне трактарнага парка рэспублікі. З мэтай вырашэння гэтага пытання мы павінны ўсямерна паскорыць будаўніцтва Мінскага трактарнага завода з тым, каб пад канец пяцігодкі атрымліваць дастатковую колькасць трактараў.

Ажыццяўленне гэтых задач звязана з кроўнымі інтарэсамі рабочых, сялян і савецкай інтэлігенцыі, з кроўнымі інтарэсамі нашай дзяржавы. Гэта будзе азначаць канец нястач і недахопаў, выкліканых вайной, будзе азначаць велізарны ўздым жыццёвага ўзроўню нашага насельніцтва, будзе азначаць новы вялікі крок ва ўмацаванні нашай дзяржавы.

Выкананне задач па адраджэнню калгаснай вытворчасці, прадугледжаных пяцігадовым планам, запатрабуе ад усяго беларускага народа і комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі велізарнага працоўнага напружання і поўнай мабілізацыі ўсіх матэрыяльных і працоўных рэзерваў.

Мы павінны сур'ёзна і строга ўзважыць абстаноўку, нашы рэзервы, нашы магчымасці, вызначыць галоўны напрамак нашых намаганняў, выбраць вядучыя звенні вельмі складанага ланцуга, які прадстаўляе сельская гаспадарка, каб, ухапіўшыся за гэтыя звенні, выцягнуць увесь ланцуг.

Пяройдзем да разгляду галоўных пытанняў аднаўленчых работ у сельскай гаспадарцы і аналіза тых арганізацыйных, эканамічных і тэхнічных магчымасцей, якія ў нас ёсць.

## АДНАЎЛЕННЕ ПРАВІЛЬНЫХ СЕВАЗВАРОТАЎ У КАЛГАСАХ І РАЗВІЦЦЁ ТРАВАСЕЯННЯ

Структура пасеўных плошчаў калгасаў БССР ярка адлюстроўвала найвялікшы рэвалюцыйны пераварот, зроблены ў сельскай гаспадарцы пераходам на рэйкі калгаснага соцыялістычнага земляробства.

Пры агульным росце пасеўных плошчаў з 1913 па 1940 год на 625 тысяч гектараў, або на 24,4 процанта, плошчы пад тэхнічнымі культурамі павялічыліся на 164,9 процанта, у тым ліку пад ільном — на 185 процантаў; плошчы пад бульбай павялічыліся на 294,6 тысяч гектараў, або 91,2 процанта; плошчы пад кармавымі культурамі павялічыліся ў 3,5 раза.

У сельскай гаспадарцы Беларусі пачала ўкараняцца рацыянальная арганізацыя паляводства і выкараняцца драпежніцкае скарыстанне зямель.

Сельская гаспадарка Беларусі падцвярджала словы таварыша Сталіна, сказаныя на XVIII з'ездзе нашай партыі аб тым што:

«... наша земляробства становіцца больш кваліфікаваным і прадуктыўным, а ўкараненне правільнага севазвароту атрымлівае пад сабой рэальную глебу».

К пачатку Айчыннай вайны былі ўведзены правільныя севазвароты ў 6.280 калгасах Беларусі.

Увядзенне і асваенне правільных севазваротаў з прымяненнем травасеяння і чорных папараў мела выключна важнае значэнне. Правільнае чаргаванне сельскагаспадарчых культур стала магутнай крыніцай павышэння ўраджайнасці і неабходнай прадпасылкай для найбольш эфектыўнай планавай арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці ў калгасах БССР.

Увядзеннем севазваротаў кожны калгас намячаў асноўную лінію прагрэсіўнага развіцця калгаса на некалькі гадоў уперад у асноўнай і рашаючай галіне гаспадаркі — у паляводстве.

Масавая практыка паказала, што калгасы, асвоіўшыя правільныя севазвароты, прымяняўшыя перадавую агратэхніку, атрымлівалі найбольш высокія ўраджаі.

У выніку нямецка-фашысцкай акупацыі правільныя севазвароты знішчаны паўсямесна, ва ўсіх калгасах рэспублікі. Гэта адзін з найбольш цяжкіх удараў па сельскай гаспадарцы Беларусі. Справа не толькі ў тым, што разбурана вялікая трохгадовая работа па ўвядзенню правільных севазваротаў. Справа ў тым, што знішчэннем тэхнічных культур, і асабліва



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

травасеяння, разбурана база правільных севазваротаў, якая стваралася многа год.

У 1945 годзе правільныя севазвароты адноўлены і ўведзены ў 4.136 калгасах. Дзяржаўным планам на 1946 год прадугледжваюцца вялікія работы па аднаўленню і ўвядзенню правільных севазваротаў і ўпарадкаванню землекарыстання. У 1946 годзе павінны быць адноўлены севазвароты ў 2.200 калгасах, уведзены правільныя севазвароты ў 420 калгасах. Адноўлены дзяржаўныя акты на вечнае карыстанне зямлёй у 3.500 калгасах. Адноўлена калгасных зямельных шнуравых кніг у 9.600 калгасах. У 1948 годзе мы павінны поўнасцю закончыць увядзенне правільных севазваротаў ва ўсіх калгасах нашай рэспублікі.

Работа па ўвядзенню і асваенню правільных севазваротаў па свайму значэнню будзе з'яўляцца гістарычнай. Яна будзе азначаць уздым сельскай гаспадаркі Беларусі на новую, больш высокую ступень.

Аднаўленне правільных севазваротаў у калгасах гэта не толькі нарэзка палёў, складанне дакументацыі і г. д., але перш за ўсё аднаўленне структуры пасеўнай плошчы калгаса і поўнае аднаўленне травасеяння, г. зн. пасеваў канюшыны, серадэлы, цімафееўкі, вікі і лубіну.

Значэнне травасеяння настолькі вялікае, што яно іменна і вызначыла сабой самую перадавую сістэму земляробства — травапольную сістэму.

Без травасеяння немагчыма дабіцца атрымання ўстойліва высокіх ураджаяў усіх сельскагаспадарчых культур і высокай прадуктыўнасці жывёлагадоўлі. Травы, якія высяваюцца на палях, каштоўны не толькі тым, што даюць вельмі добрыя кармы, але яшчэ і тым, што аднаўляюць пладароднасць глебы і садзейнічаюць павышэнню ўраджайнасці ўсіх сельскагаспадарчых культур.

Буйнейшы рускі вучоны, акадэмік В. Р. Вільямс гаварыў, што стварыць або аднавіць пладародную структуру глебы немагчыма ні апрацоўкай, ні ўнясеннем угнаенняў. Яе можна аднавіць толькі шляхам вырошчвання шматгадовых траў.

Для Беларусі гэтыя словы Вільямса павінны быць узведзены ў ступень абавязковага закона аднаўлення і развіцця земляробства.

Таму можна сказаць прама, што ўздым нашага земляробства, пры ўсіх іншых умовах, будзе ў прамой ступені залежаць ад увядзення севазваротаў і аднаўлення ў неабходным размеры травасеяння.

Важнейшае значэнне для падняцця ўзроўню сельскай гаспадаркі мае канюшына. Гэта выключна каштоўная культура, якая дае вялікія ўраджаі, па спажыўнасці на 20 — 25 процантаў вышэй лугавога сена.

Апрача кармавой каштоўнасці, канюшына мае велізарнае агратэхнічнае значэнне. Каранёвая сістэма канюшыны паляпшае фізічныя ўласцівасці глебы, надае ёй дробнакамкаватую будову, павялічвае трываласць структуры глебы, узбагачае глебу азотам ад 50 да 150 кілаграмаў на гектар, што адпавядае колькасці азота, які змяшчаецца ў 20 тонах гною.

Канюшына значна павышае ўраджайнасць ідучых за ёю культур, асабліва пшаніцы. Лён пасля канюшыны дае самыя высокія і лепшыя па якасці ўраджаі.

Адрадзіць канюшынасеянне ў бліжэйшыя тэрміны — гэта значыць, у першую чаргу, вырашыць пытанне аб насенні канюшыны.

Але нават калі нам удасца закупіць насенне канюшыны або завесці яго з іншых абласцей Саюза, нам не адрадзіць канюшынасеяння, калі ў раёнах і калгасах не будуць цаніць насенне канюшыны, як золата.

Старшыня калгаса імені Мяснікова, Бярэзінскага раёна, Марыя Нікалаеўна Еўдакімчык расказала на адным з перадвыбарных сходаў, як калгаснікі пасля вызвалення ад фашысцкіх захопнікаў знеслі ў праўленне калгаса ў хустачках, панчохах і мяшэчках жменькі захаванага імі насення канюшыны. Зараз у калгасе поўнасцю ўжо адноўлены канюшынішчы за кошт узноўленага калгасам насення. Між тым побач размешчаныя калгасы, якія маюць аднолькавыя з калгасам імені Мяснікова ўмовы, нічога падобнага не прарабілі і насеннем канюшыны не забяспечаны.

Узнаўленню насення канюшыны ў кожным калгасе трэба надаць выключнае значэнне.

Віка яравая—аднагадовая бабовая расліна, якая з'яўляецца каштоўным кормам для жывёлы як у зялёным выглядзе, так і ў выглядзе сена. У Беларусі віка высяваецца ў сумесі з аўсом і дае ўраджай ад 19 да 30 цэнтнераў сена з гектара. Пасевы вікі ў калгасах Беларусі займаюць першае месца сярод вырошчваемых аднагадовых кармавых траў.

Віка шырока прымяняецца ў севазвароце як папаразаймаючая культура на зялёны корм.

У раёнах пясчаных глеб Беларусі прымяняліся пасевы серадэлы. У 1940 годзе яна займала плошчу ў 8.000 гектараў.

Серадэла — аднагадовая бабовая расліна, якая з'яўляецца



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

незамянімай раслінай падсеўнага тыпу. Яна не толькі ўзбагачае глебу азотам, але дае вельмі добрае сена, якое не ўступае па сваіх якасцях канюшыннаму сену.

Серадэлу па праву называлі канюшынай пясчаных глеб.

Нават у тым выпадку, калі серадэла не заворвалася на зялёнае ўгнаенне, а ўбіралася на сена, яна павышала ўраджай бульбы на 33 цэнтнеры з гектара, а жыта — на 2 цэнтнеры з гектара.

Серадэла таксама з'яўляецца каштоўным зялёным угнаеннем. Так, паводле даных Мінскай станцыі, бульба, пасаджаная па заворанай серадэле, дала прырост ураджаю ў 37 цэнтнераў на гектар, а прырост ураджаю наступнай культуры склаў 1,9 цэнтнера з гектара. На Новазыбкаўскай вопытнай станцыі прырост ураджаю бульбы па заворанай серадэле склаў 55 цэнтнераў з гектара.

Падсяваць серадэлу пад збожжавыя культуры можна не толькі восенню, але і вясной. Пры веснавым падсеве пад жыта яна дае ўкосы вельмі добрага корму, не займаючы іншых палёў. Такім чынам, з аднаго ўчастка поля знімаюцца два ўраджаі — ураджай збожжа і ураджай сена.

За перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі пасевы серадэлы амаль зніклі.

Задача заключаецца ў тым, каб наяўнае насенне серадэлы скарыстаць, прыняць меры к дадатковаму збору насення і на пясчаных глебах укараніць пасевы серадэлы ў севазвароты.

У 1946 годзе неабходна давесці пасевы серадэлы да 7.000 гектараў.

Цімафееўка — шматгадовая злакавая кармавая трава. У Беларусі яе засяваюць у асноўным у сумесі з канюшынай, што яшчэ больш паляпшае структуру глебы і павялічвае травастой канюшыны пры шматгадовым скарыстанні.

Ураджай насення атрымліваецца 5 і больш цэнтнераў з гектара. Ураджай сена дасягае 60 цэнтнераў з гектара. У сумесі з канюшынай цімафееўка значна павялічвае збор кармавой масы.

Пасевы цімафееўкі на насенне ў Беларусі ў 1940 годзе складалі 1.525 гектараў, а ў 1945 годзе цімафееўка не засявалася. Пасевы цімафееўкі трэба таксама адрадзіць.

Ва ўмовах Беларусі перспектыўнай кармавой культурай з'яўляецца люцэрна. Яна характарызуецца высокімі кармавымі якасцямі (сена люцэрны ў сярэднім утрымлівае звыш 12 працантаў бялка), добрай адрастаемасцю пасля ўкосаў, дае ўраджай на працягу 6 і больш гадоў.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Да гэтага часу ў БССР люцэрны не было ў вытворчых пасевах. Між тым, паводле даных Турскай сельскагаспадарчай вопытнай станцыі і Акадэміі навук БССР, сінегібрыдная люцэрна для ўмоў БССР з'яўляецца прыймальнай культурай.

У планах травасеяння, асабліва ў паўднёвых абласцях БССР, павінна быць удзелена ўвага культуры люцэрны.

Лубін, як зялёнае ўгнаенне, на глебах Беларусі мае велізарнае значэнне для атрымання ўстойлівых ураджаяў.

Лубін — расліна, збіраючая азот. На адным гектары засеянага лубіну ў глебе накапляецца да 200 кілограмаў азота. Лубін змяшчае ў сабе калій, фосфар і іншыя мінеральныя вяшчэствы і з'яўляецца універсальным і выдатным па выгаднасці ўгнаеннем. Гектар лубіну замяняе 30 — 35 тон хлеўнага гною.

У СССР лубін да вайны быў найбольш распаўсюджан у Беларускай ССР. Пасеўныя плошчы пад лубінам у БССР складалі: 1918 год — 110 гектараў, 1928 год — 5.184, 1931 год—27.581, 1935 год—32.515, 1940 год—46.600 гектараў.

Лубін, як угнаенне, быў шырока прызнан, і ён ужо ажыццяўляў сваё пераможнае шэсце па калгасах, прыносячы ўсюды павышэнне ўраджаяў.

На Палескай вопытнай станцыі быў атрыман ураджай збожжавых без угнаенняў — 4,2 цэнтнера, па лубіну — 8,55 цэнтнера з гектара; бульбы пры ўнясенні 18 тон гною — 100 цэнтнераў і па лубіну — 122 цэнтнеры з гектара.

На Турскай вопытнай станцыі на падзолістых глебах атрыман ураджай азімага жыта, пасеянага па лубіну, — 13,2 цэнтнера з гектара пры кантрольным ураджаі ў 7,8 цэнтнера. Лубін, прыменены ў выглядзе падсеўнай формы зялёнага ўгнаення, даў ураджай бульбы ў 165 цэнтнераў з гектара пры кантрольным ураджаі ў 135 цэнтнераў.

Нездарма ў многіх абласцях лубіну далі надзвычай верную паэтычную назву «вярні сонца».

Асабліва павышаецца ўраджай пры сумесным прымяненні лубінавай зялёнай масы і гною, таму што гной паскарае працэс разлажэння зялёнай масы. Гэта атрымала падцверджанне ў доследах Палескай, Мінскай, Пскоўскай і іншых вопытных станцый.

У Беларусі пры ўвядзенні правільных севазваротаў і поўным аднаўленні даваенных пасеўных плошчаў будзе 550 тысяч гектараў папараў. Калі заняць з гэтай плошчы пад лубін толькі 100 тысяч гектараў, то агульная сума фіксіруемага за год азота складае 20 тысяч тон, або ў пераводзе на сульфат-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

амоній—100 тысяч тон. Пасеў такой колькасці лубіну заменіць не менш трох мільёнаў тон гною.

У Беларусі пасеў лубіну магчымы не толькі па папары, але па жніўю, і гэта добра аплачваецца ў наступным годзе ўраджаем бульбы і іншых яравых культур.

Калі лубінавае ўгнаенне мае велізарнае значэнне для бедных пясчаных глеб, на якіх не расце канюшына, то гэта не значыць, што яго роля павінна абмежавацца толькі гэтымі глебамі. Вопыт паказвае, што на больш багатых супясчаных і сугліністых глебах лубінавае ўгнаенне дае яшчэ большы прырост ураджаю, чым на пясках. Таму нават наяўнасць канюшыны ў севазвароце не перашкаджае пасеву лубіну ў папаравым полі.

У мінулым годзе нашы калгасы засеялі да 5.000 гектараў лубіну на насенне. Аднак калгасы і нашы работнікі аднесліся няўважліва да лубіну. У многіх месцах ён быў пасеян позна, не даспеў, і насенне не сабрана.

Трэба берагчы пасевы лубіну. Трэба ўстанавіць кантроль і нагляд з боку зямельных органаў, партыйных і савецкіх арганізацый за кожным гектарам лубіну. Раённыя партыйныя і савецкія кіраўнікі, загадчыкі раённымі зямельнымі аддзеламі павінны захаваць кожны кілограм лубіну, каб развесці гэтую культуру ў раёнах. Трэба практыкаваць сур'ёзнае заахвочванне за здаваемае насенне лубіну.

Мы павінны ў што-б там ні стала пяцігадовы план пасеваў лубіну выканаць ужо ў 1948 годзе, а к 1950 году план пяцігодкі перавыканаць у паўтара — два разы.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## АБ ШЫРОКАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ МЯСЦОВЫХ УГНАЕННЯЎ

Калі мы гаворым аб шляхах павышэння ўраджайнасці, то амаль што на першае месца трэба паставіць пытанне аб угнаеннях.

Яшчэ Маркс у «Капітале» пісаў, што абмен вяшчэстваў паміж чалавекам і зямлёй, г. зн. зварот глебе састаўных частак, узятых у яе ў форме сродкаў харчавання і адзення, з'яўляецца вечнай, натуральнай умовай пладароднасці глебы.

Апрача такіх зусім неабходных мерапрыемстваў, як культурная апрацоўка глебы, захаванне правільнага чаргавання культур, расшырэнне пасеваў шматгадовых траў, галоўнейшым фактарам ураджаю з'яўляецца ўнясенне неабходнай колькасці і адпаведнай якасці ўгнаенняў.

Беларусь — гэта не Украіна, не Кубань, не чорназёмная паласа. Беларусь размешчана ў зоне супясчаных, падзолістых глебаў з вялікім распаўсюджаннем вельмі вышчалачаных глебаў, глебаў з павышанай кіслотнасцю, прадукцыйнасць якіх у натуральным стане стаіць на нізкім узроўні. Без дастатковай колькасці ўгнаенняў тут не будзе добрага ўраджаю—ні хлеба, ні ільну, ні бульбы.

Калі не знайсці крыніц вытворчасці і накаплення ўгнаенняў, не ўзняць пытанне аб адшуканні ўгнаенняў, як рашаючае ў барацьбе за ўраджай, і не прыняць належных дзяржаўных мер, нам не аднавіць пладароднасці глебаў Беларусі.

Значыцца, арганізацыі і расшырэнню вытворчасці ўгнаенняў, атрыманню новых відаў угнаенняў мы павінны надаць выключнае значэнне.

Якія рэсурсы ўгнаенняў мы маем для ўздыму ўраджаю?

### а) Гной

Гноем, як угнаеннем, беларускія сяляне карыстаюцца сотні гадоў. Яны ведаюць яго цудадзейную сілу. Народная мудрасць склала нямала прыгаворак і прыказак аб значэнні гною, як фактара павышэння ўраджайнасці. Адна з найцікавейшых беларускіх прыказак, запісаных яшчэ ў мінулым стагоддзі, гаворыць: «Гной крадзе ад бога сваю долю».

Народная сялянская мудрасць настолькі высока ацэньвае гной, што яшчэ ў далёкі стары час ставіць яго сілу вышэй нябесных сіл. Другая беларуская прыказка гаворыць: «Калі кладзеш гной, то збярэш удвой». У Магілеўскай губерні гаварылі: «Кладзі гной густа, не будзе ў клеці пуста».

Далей ідуць такія прыказкі:

«Дай зямлі, і яна табе дасць».

«Пад азім унавозіш, у шаброў куска не папросіш».

«Вазі гной, не ляніся, так хоць богу не маліся».

З гэтага відаць, што гной, з прычыны яго ўплыву на пладароднасць глебы, на ўраджай, карыстаўся паўсямесным прызнаннем. Воз з угнаеннем карыстаўся вялікай пашанай, ён быў важней карэты, якая вязла гуляшчага шляхціча ці чыноўніка, або падводы з ездакамі на базар. Гною ў Беларусі ўсе дарогу ўступаць павінны былі.

Якія залатыя, поўныя глыбокага сэнсу традыцыі!

Такое прызнанне сялянамі гною, вялікія традыцыі яго прымянення,—пры калгасным ладзе, калі кожны селянін меў аса-

бістую жывёлу і развілася шырока калгасная жывёлагадоўля, і вызначыла гіганцкія маштабы прымянення гною на калгасных палях.

У 1940 годзе было ўнесена на калгасныя палі 11 мільёнаў тон гною. Гэта адыграла выключную ролю ў павышэнні ўраджаю.

У сучасны момант, у сувязі са змяншэннем пагалоўя жывёлы, гною стала значна менш. Увесь выхад гною пры існуючым пагалоўі складае 6,3 мільёна тон у год, у тым ліку 2,9 мільёна тон ад жывёлы калгасаў і 3,4 мільёна тон ад асабістай жывёлы калгаснікаў. Значыцца, на калгасныя палі за кошт жывёлагадоўчых ферм калгасаў у 1946 годзе можна ўнесці 2,9 мільёна тон гною і за кошт жывёлы калгаснікаў 1,4 мільёна тон, пакінуўшы для прысядзібных участкаў 2 мільёны тон. Пры гэтых умовах у бягучым годзе ўдасца ўнесці на калгасныя палі гною крыху больш 4 мільёнаў тон. Гэтага, вядома, недастаткова для таго, каб атрымаць добры ўраджай.

Значыцца, наша задача заключаецца ў тым, каб максімальна павялічыць вытворчасць гною. Для гэтага ў нас ёсць вельмі спрыяльныя ўмовы.

Перш чым перайсці да пытання аб павелічэнні вытворчасці гною, зробім некалькі заўваг, якія адносяцца да павышэння яго якасці.

Многія калгасы не ўдзяляюць дастатковай увагі пытанню прыгатавання, збору і захоўвання гною. Гной скідваецца вакол скотнага двара, канюшні, свінарніка ў беспарадачныя кучы. Тут ён вышчалачваецца дажджом і снегам, утаптваецца ў гразь. Гноевая жыжа, галоўная крыніца ўгнаення, якая надае асноўную каштоўнасць гною, прападае. Такі гной, унесены на палі, ужо абясцэнен больш чым напалавіну.

У стары час адносна расцяп, якія не ўмелі цаніць і збіраць жыжу, народ склаў добрую пагаворку: «У каго з двара цячэ жыжа, у таго будзе пустая дзяжа».

Абавязковая і важнейшая ўмова барацьбы за ўраджай — гэта неадкладнае ўпарадкаванне збору гною, стварэнне належных умоў захоўвання яго.

Задачу павелічэння вытворчасці гною ў нас звычайна звязваюць толькі з павелічэннем пагалоўя жывёлы. Да гэтага часу амаль не ставілася галоўнае для нашай сельскай гаспадаркі пытанне, якое заключаецца ў павышэнні выхаду гною на галаву жывёлы і палепшанні якасці гною. У гэтых адносінах у нас ёсць велізарныя магчымасці. Яны цяснейшым чынам звязаны з агульным палепшаннем утрымання жывёлы, коль-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

касцю і якасцю кармоў, спажываннем жывёламі солі і нармальнай пойкай і асабліва колькасцю і якасцю падсцілкі, якая ўжываецца для жывёлы.

Гутарка ідзе і аб шырокім укараненні ў калгасах вытворчасці тарфянога гною.

### б) Вытворчасць тарфянога гною

Тарфяны гной дае лепшыя вынікі ў параўнанні з саламяным гноем. У праведзеных шматлікіх доследах перавага тарфянога гною перад саламяным устаноўлена ў 62 выпадках са 100, а роўнацэннасць тарфянога з саламяным — у 38 выпадках са 100.

Гной, прыгатаваны на тарфяной падсцілцы, павялічвае ўраджай бульбы і корнеплодаў на 25—30 працантаў і збожжавых культур—на 10—12 працантаў супроць ураджаю, які атрымліваецца па саламянаму гною.

На Алфераўскім вопытным полі Маскоўскай вобласці, на супясчанай глебе на працягу 5 гадоў праводзілі параўнальныя выпрабаванні тарфянога і саламянага гною. Сярэднія ўраджаі за пяцігоддзе былі атрыманы наступныя: без угнаення—13,2 цэнтнера з гектара, па саламянаму гною—19,4, па тарфяному гною—21,2 цэнтнера з гектара.

У БССР прымяненне торфу непасрэдна на ўгнаенне прыняло шырокія размеры, але вытворчасць гною шляхам скарыстання торфу замест саломы на падсцілку жывёле шырокага распаўсюджання не атрымала. Тлумачыцца гэта тым, што мы не здолелі перайсці ад прымітыўнага, прымянянага яшчэ ў сярэдневяковае спосабу ўжывання ў выглядзе звычайнай падсцілкі раздробненага торфу на падлогу кароўніка або канюшні да сучаснага, эфектыўнага, шырока распаўсюджанага спосабу ўжывання торфу на падсцілку ў выглядзе злёгку спрасаваных пліт-кіп. Гэтыя кіпы вырабляюцца на нескладаных прадпрыемствах, галоўным элементам абсталявання якіх з'яўляюцца драбілка-трапалка, сіта і прэс.

Працэс вырабу такой падсцілкі просты. Здабыты торф прасушваецца да 35 працантаў вільготнасці, дробіцца, прасейваецца на дзве фракцыі і прасуецца прэсам у пліты, прыкладна, размерам 1×0,6×0,5 метра.

На невялікіх торфападсцілачных прадпрыемствах аперацыя прасоўкі праводзіцца на ручных прэсах, пры гэтым брыгада ў тры чалавекі на працягу 8 гадзін спрасуе каля 60—90 кіп, або 3—4 тоны падсцілкі.

Прымяняецца гэтая падсцілка шляхам укладвання на падлогу памяшканняў, у якіх утрымліваецца жывёла. Яна стварае жывёле ідэальныя ўмовы ўтрымання і дае самай высокай якасці гной, бо ўбірае ў сябе ўсе экскрэменты жывёлы і ўносіць у глебу пажыўныя вяшчэствы ў найбольш засваяемай раслінамі форме. Такая торфападсцілка добра паглынае вадкасці і газы, таму стойлы жывёлы заўсёды сухія і паветра ў хлявах чыстае, не назіраецца вельмі распаўсюджаных хвароб ног жывёл—гніенне стрэлак, макрыцы і г. д.

Тарфяная падсцілка паляпшае гігіенічныя ўмовы ўтрымання жывёлы, павялічвае ўдой і нагул мяса. Гэта адбываецца ад таго, што торфападсцілка мала цеплаправодная, дзякуючы чаму цела жывёлы ізаліравана і не церпіць ад халоднай падлогі скотнага двара.

У 1936 годзе ў калгасе «Победа», Чарапавецкага раёна, Валагодскай вобласці, праведзен на працягу 97 дзён дослед з адкормам цялят, якія ўтрымліваліся на саламянай і тарфяной падсцілках. Цяляты былі аднаго ўзросту і ўкормленасці. Дзевяць цялят на тарфяной падсцілцы далі прырост 103 кілограмы, а на саламянай толькі 62 кілограмы, не гледзячы на аднолькавы харчовы рацыён.

У Расіі ў 1900 годзе паявіліся тры фабрыкі, вырабляўшыя тарфяную падсцілку. Першыя сістэматычныя доследы з торфападсцілкай і тарфянымі ўгнаеннямі былі пачаты ў Петроўскай сельскагаспадарчай Акадэміі ў 1915 годзе прафесарам, зараз акадэмікам Дзмітрыем Нікалаевічам Пранішнікавым і Іванам Вячэслававічам Якушкіным.

У СССР да 1929 года доследным шляхам здабывалася тарфяной падсцілкі каля 5 тысяч тон. У 1929 годзе, па рашэнню ўрада, быў арганізован «Сельгасторфатрэст», у задачу якога ўваходзіла арганізацыя торфападсцілачнай справы ў РСФСР.

У 1933 годзе было выпрацавана ўжо 33 тысячы тон падсцілкі, ахвотна разабранай спажыўцамі.

У Латвіі з 1933 года таксама пачала развівацца вытворчасць торфападсцілкі. Перад вайной ужо існавала тры заводы, выпрацоўваўшыя каля 200 тысяч кубаметраў падсцілкі. Латвія экспартавала падсцілку ў Галандыю і Францыю.

Не гледзячы на вельмі багаты вопыт, вопыт РСФСР і Латвіі, у Беларусі тарфяная падсцілка ніколі не выраблялася і пытанне аб яе вытворчасці сур'ёзна не ставілася.

Мы павінны ў бліжэйшы час развіць вытворчасць тарфяной падсцілкі на невялікіх прадпрыемствах раённай прамы-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

словасці для нашых калгасаў, соўгасаў, аднаасобных гаспадарак і іншых сельскагаспадарчых спажыўцоў.

Прадпрыемства па вытворчасці тарфяной падсцілкі нескладанае. Гэта — драўляны сарай з нескладаным абсталяваннем. Нават прэс зроблен з дрэва. Такі завод падсілу любому нашаму калгасу, а тым больш соўгасу. Неабходна зусім тэрмінова, літаральна ў 1 — 2 месяцы, пабудаваць 2 — 3 такія заводы, пусціць іх у ход, на іх аснове стварыць праект тыповага завода для кожнага раёна і ўжо ў гэтым годзе мясцовымі сіламі пабудаваць такія заводы ў кожным раёне.

Прастата абсталявання і вытворчасці, вялікія практычныя магчымасці ствараюць умовы для праяўлення ў гэтай справе шырокай мясцовай ініцыятывы.

Наяўнасць практычна неабмежаваных, расканцэнтраваных па ўсёй тэрыторыі запасаў сыравіны торфу дазваляе прыступіць паўсямесна ў калгасах да вытворчасці торфападсцілкі і арганізаванага вырабу торфагною. Гэта павінна з'явіцца ва ўмовах Беларусі адной з важнейшых крыніц павелічэння ўрадлівасці глебы.

## в) Торфафекальныя ўгнаенні

Сур'ёзнейшай у нашых умовах крыніцай узбагачэння глебы з'яўляюцца найбагацейшыя азотам торфафекальныя ўгнаенні. Пажыўныя матэрыі фекальных ўгнаенняў знаходзяцца ў больш засваяемай раслінамі форме, і таму гэтыя ўгнаенні з'яўляюцца канцэнтраванымі і найбольш хутка дзеючымі.

Ідэя скарыстання адкідаў на ўгнаенне вядома даўно. У Кітаі і Індыі адкіды скарыстоўваліся на ўгнаенне палёў і забяспечвалі ўраджаі тысячы гадоў назад. У Кітаі ўносіцца на палі звыш 120 мільёнаў тон фекальнай масы. У Францыі, Галандыі, Індыі шырока скарыстоўваюць фекалій у чыстым выглядзе або нарыхтаваны ў ямах у выглядзе розных кампостаў.

У Совецкім Саюзе існуюць палі абвадненняў і вопытныя станцыі, даказаўшыя станоўчае значэнне прымянення торфафекальных угнаенняў. Аб гэтым гаворыць таксама станоўчы вопыт многіх калгаснікаў і калгасаў.

Інстытутам соцыялістычнай сельскай гаспадаркі Акадэміі навук БССР, які прымяніў торфафекальны кампост, быў атрыман ураджай кармавых буракоў у 745 цэнтнераў з гектара, пры ўраджаі кантрольнага поля ў 151 цэнтнер, і ўра-

джай бульбы ў 265 цэнтнераў з гектара, пры кантрольным ураджаі ў 109 цэнтнераў.

Калгас «Большэвік», Барысаўскага раёна, прымяняючы торфафекальныя кампосты, дабіўся рэзкага павелічэння ўраджаю ўсіх сельскагаспадарчых культур. Адно стаханаўскае звяно, прымяняючы торфафекальныя ўгнаенні, у 1936 годзе з 4 гектараў бульбы сабрала па 558 цэнтнераў з гектара. Сярэдні ўраджай бульбы ў гэтым калгасе напярэдадні вайны быў роўны 220 цэнтнерам з гектара. У гэтым-жа калгасе збожжавыя культуры давалі ў сярэднім не менш 15 цэнтнераў з гектара, а на асобных участках ураджай іх даходзіў да 25—30 цэнтнераў.

У калгасе «Маяк соцыялізма», гэтага-ж раёна, таксама даўно прымяняюцца торфафекальныя кампосты, і калгас таксама штогод атрымлівае высокія ўраджаі.

Такіх калгасаў, на жаль, нямнога, але яны паказалі, што можна зрабіць, калі пераадолець прадрассудкі, калі па-сапраўднаму ўступіць на шлях барацьбы за высокі ўраджай.

Няцяжка даказаць выгады і перавагі фекальных угнаенняў, яны, бадай, усім зразумелы, але ўкараніць угнаенні было куды больш цяжка, таму што спосабы прымянення іх не былі распрацаваны, былі антысанітарнымі, агіднымі; вывезены на палі фекалій разносіў смурод. Таму ў народзе існавалі пагардлівыя адносіны да фекальных угнаенняў. Займацца гэтым лічылася ледзь не ганьбаю.

Мы праходзілі міма велізарнага вопыту, накопленага нашымі перадавымі калгасамі, якія знайшлі зусім санітарныя спосабы прымянення фекалія.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Найбольш дасканалы спосаб абясшкоджання нечыстот з адначасовым атрыманнем у поўнай меры добраякаснага ўгнаення заключаецца ў кампастыраванні фекалія з торфам у саміх прыбіральнях. Прыгатаванне торфакампоста рэзка павышае гноевую каштоўнасць фекалія. Паглынальная здольнасць торфу вельмі вялікая, вільготнаёмкасць яго значна вышэй вільготнаёмкасці саломы. А торфу ў нас шукаць не трэба, ён пад рукамі ўсюды.

Фабрыку кампостнага ўгнаення, калі так можна сказаць, можна пабудаваць у кожным двары—гэта нескладаная пабудова, самага звычайнага тыпу, драўляная, плятнёвая або якая-небудзь іншая прыбіральня, але толькі без ям, а з высоўнымі скрынямі, адкуль фекалій, ужо змешаны з торфам, праз пэўны перыяд часу збіраецца ў вялікія кампостныя скрыні або кучы.

На кожнай сядзібе калгасніка мы можам атрымаць за год не менш 2 — 3 тон такога кампостнага ўгнаення. Пры арганізацыі вытворчасці кампостнага ўгнаення на ўсіх 750 тысячах калгасных сядзіб можна атрымаць не менш 2 мільёнаў тон высокаякасных угнаенняў, роўных 3 — 4 мільёнам тон гною.

Апрача таго, мы аздаровім населеныя месцы, зменшым інфекцыйныя захворванні як сярод дарослых, так і ў асабліwасці сярод дзяцей. Павысіцца санітарны і культурны стан вёскі.

Трэба таксама прадумаць пытанне аб вытворчасці фекальных угнаенняў, напрыклад торфапудрэтаў, скарыстоўваючы фекаліі вялікіх гарадоў.

Калі мы сапраўды хочам дабіцца павышэння ўраджайнасці, мы павінны пераадолець коснасць і дабіцца арганізаванай і паўсямеснай вытворчасці торфафекальных угнаенняў. Вынікі гэтага мерапрыемства наступяць хутка, яны пераўзыйдуць усе чаканні.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

### г) Попел

Попел мае ў сабе ўсе пажыўныя для расліны матэрыі, за выключэннем азота. Ён каштоўны як калійнае ўгнаенне.

Дзякуючы наяўнасці ў сваім саставе вапны, попел змяншае кіслотнасць глебы. Ён павышае ўраджай не толькі раслін, пад якія ён уносіцца, але і наступных за імі культур.

Попел заваяваў сабе прызнанне і як сродак падкормкі азімых збожжавых і тэхнічных культур.

Вопыт калгасаў, прымяняючых попел як угнаенне, паказаў, што кожны цэнтнер попелу павялічвае ўраджай збожжавых не менш чым на 50 кілограмаў з гектара.

Бульба стаіць на першым месцы па прыбаўцы ўраджаю ад прымянення калійных угнаенняў, прычым найбольшыя прыбаўкі атрымліваюцца на лёгкіх пясчаных і супясчаных глебах.

Калі прыняць у разлік нават мінімальны выхад попелу з печы ў год 1,5 цэнтнера і лічыць, што ў кожнай гаспадарцы ў нас адна печ, то толькі ў калгасных гаспадарках мы можам сабраць 125.000 тон попелу.

Апрача таго, можна атрымаць дадаткова ў кожным калгасе 2—3 тоны попелу, спальваючы рознага роду смецце, пустазелле і асабліва быльнік, напрыклад крапіву і лебяду,

якія даюць найбольшы выхад попелу пры спальванні з найбольш высокім процантам утрымання калія.

Калі попел з'яўляецца такім добрым і амаль універсальным угнаеннем, то, значыць, мы павінны паставіць пытанне аб збіранні попелу ўсюды—на заводах, фабрыках, у лазнях, сталовых, жылых дамах і г. д.

Гэтую справу трэба паставіць шырока, па-дзяржаўнаму. Неабходзен закон, згодна якога спажыўцы паліва павінны збіраць і здаваць попел. Трэба ўсяляк прапагандаваць збор попелу, выдаць плакаты, расказаць вучням у школе, да збору попелу трэба прыцягнуць піянераў, комсамол, грамадскасць, і мы атрымаем каласальны эфект.

Калі ўлічыць рэсурсы гарадоў, то нават пры збіранні невялікай часткі гадавога выхаду попелу, мы будзем мець штогод 200.000 тон попелу. Гэта нам заменіць 225.000 тон прывозных мінеральных угнаенняў.

Пад ураджай 1946 года можна і трэба сабраць да вясны 10—15 тысяч тон попелу і далей штогод неабходна ўстанавіць план збору не менш 200.000 тон попелу або 10 тон на кожны калгас.

Рэалізацыя толькі аднаго гэтага мерапрыемства можа даць нам дадаткова не менш 6 мільёнаў пудоў зярна.

Калі ўгнаенні ў прамым сэнсе вырашаюць ураджай, калі кожная тона гною, торфу, торфафекалія і попелу, унесеная ў глебу, можа быць прама пералічана ў хлеб, то ці можам мы, калі мы сапраўды хочам узняць ураджай, задаволіцца колькасцю ўгнаенняў, атрыманых па прынцыпу: «колькі зграбуць».

Ці не ясна, што галоўнае зараз для ўздыму ўраджаю — гэта большэвіцкая дзяржаўная арганізацыя збірання і вытворчасці мясцовых угнаенняў. Без гэтага мала будуць варты ўсе нашы іншыя мерапрыемствы ў сельскай гаспадарцы.

## АБ МІНЕРАЛЬНЫХ УГНАЕННЯХ

Глебы рэспублікі для павышэння іх ураджайнасці патрабуюць унясення мінеральных угнаенняў — азотных, фасфарытных, калійных.

Да вайны ў Беларусі ў глебу ўносілася невялікая колькасць завазімых мінеральных угнаенняў. Найбольшая колькасць была ўнесена ў 1940 годзе. Яна раўнялася 120 тысячам тон.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

Патрэбнасць вялікай колькасці вагонаў, дальнасць перавозак і іншыя затраты абмяжоўвалі ўжыванне мінеральных угнаенняў.

Для далейшага развіцця сельскай гаспадаркі патрабуецца павелічэнне колькасці ўнасімых мінеральных угнаенняў па крайняй меры ў 3—4 разы. Гэтую задачу можна вырашыць у тым выпадку, калі, апрача завозу з іншых абласцей, рэспубліка будзе мець і ўласную вытворчасць мінеральных угнаенняў. А для гэтага ў БССР ёсць усе магчымасці.

Сыравінай для вырабу аміяка і на яго аснове азоцістых угнаенняў можа служыць торф. Атрыманне аміяка з торфу можа быць арганізавана двума асноўнымі шляхамі: першы — праз улаўліванне ўтвараемага аміяка на газіфікацыйных установках электрастанцый і шклозаводаў і, другі, — шляхам сінтэза аміяка з азотна-вадароднай сумесі. Абодва гэтыя спосабы могуць быць ажыццёўлены прамысловасцю БССР паралельна.

Мы маем рэальныя магчымасці, паступова развіваючы выраб аміяка, да канца пяцігодкі выпрацоўваць 15 тысяч тон аміяка, што адпавядае 60 тысячам тон 20-працантнага сульфатамонія. Гэтага дастаткова, каб угнаіць 240 тысяч гектараў.

У БССР ёсць глебы, якія патрабуюць фасфарытных угнаенняў. На гэтых глебах добры эфект давала фасфарытная мука. Спосабы кампаставання фасфарытнай мукі з гноем даюць магчымасць скарыстаць яе не толькі на кіслых, але і на слаба кіслых і нейтральных глебах.

Крычаўскі фасфарытны завод, які працаваў да вайны, даваў 10 тысяч тон фасфарытнай мукі.

Трэба падкрэсліць, што фасфарытная мука—угнаенне цяжка растварымае, яно не аказвае ў першы год рэзка прыкметнага ўплыву на ўраджай. У выніку гэтага ў большасці калгаснікаў і склалася думка, што фасфарытная мука не з'яўляецца добрым угнаеннем. Вядомы выпадкі, калі калгаснікі, пасланыя за фасфарытнай мукой, бралі гэтую муку і, не даязджаючы да свайго калгаса, раскідвалі на чужыя палі. **(У зале ажыўленне, смех.)** Яны рабілі вялікую памылку.

Калі фасфарытная мука ў першы год карыстання не дае значнага эфекту, то трэба мець на ўвазе, што вынікі фасфарытнай мукі сказваюцца ў наступныя два-тры гады. Асабліва гэта важна ў адносінах да падзолістых глебаў.

Шырокае прымяненне фасфарытаў на нашых землях не толькі павысіць ураджаі жыта і іншых збожжавых культур, але і зменшыць кіслотнасць глебаў, чым створыць больш

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

спрыяльныя ўмовы для росту канюшыны, лубіну і іншых бабовых.

Па пяцігадоваму плану мы павінны аднавіць здабычу фасфарытаў і арганізаваць вытворчасць узбагачанай фасфарытнай мукі ў шэсць разоў больш, чым выраблялася да вайны.

## ВАПНАВАННЕ ГЛЕБАЎ

У Беларусі ёсць абшырныя плошчы глебаў з лішняй, шкоднай для большасці сельскагаспадарчых раслін кіслотнасцю. Аграхімічныя ўласцівасці такіх глебаў могуць быць карэнным чынам выпраўлены шляхам вапнавання.

Вапнаванне не толькі павышае пладароднасць глебы, але і стварае ўмовы, якія садзейнічаюць павышэнню эфектыўнасці іншых агратэхнічных мерапрыемстваў, у прыватнасці прым'янення ўгнаенняў.

Вапнаванне ў Беларусі з'яўляецца адной з самых неабходных умоў для паспяховага ажыццяўлення канюшынасеяння. На жаль, да гэтага часу ў нас з гэтым зусім не лічыліся і ўпорна прабавалі разгарнуць канюшынасеянне незалежна ад вапнавання кіслых глебаў. Між тым, на кіслых глебах без вапнавання апошніх нідзе ў больш ці менш шырокім маштабе канюшынасеянне не праводзіцца.

Да вайны ў Беларусі існаваў мінімальны план вапнавання—1.000 гектараў глебаў з унясеннем 5.000 тон вапны. Наяўнасць у большасці раёнаў вапняка стварае магчымасць правядзення вапнавання. Дарэчы сказаць, для вапнавання годны тарфяны попел.

Наркамзему БССР неабходна распрацаваць перспектыўны план вапнавання глебаў і змагацца за яго выкананне. Гэта будзе адным з важных мерапрыемстваў у барацьбе за павышэнне пладароднасці глебы.

## НАСЕННЕВОДСТВА

Нельга дабіцца сур'ёзнага павышэння ўраджаю, не забяспечыўшы пасевы сартавым насеннем. Навукай і практыкай устаноўлена, што пасевы сартавым насеннем даюць павышэнне ўраджайнасці па збожжавых культурах на 15—20 процантаў, па бульбе—20—25 процантаў, па гароднінных культурах—да 30 процантаў. Вядома, што сартавое насенне адной і той-жа культуры, але розных сартоў, таксама дае розныя ўраджаі, у залежнасці ад прыстасаванасці іх да мясцовых умоў.

Па ітогавых даных дзяржаўнага сортавыпрабавання за 1939 год на Дрысенскім, Полацкім, Гарадоцкім, Лепельскім і Ушацкім сортаўчастках ураджай збожжа азімай пшаніцы сорту «Лютэсцэнс 1866», выведзенай Беларускай селекцыйнай станцыяй, атрыман у 17,4 цэнтнера з гектара, у той час, як менш зімастойкі сорт «Маскоўскі 2411» у тых-жа ўмовах за той-жа год даў 8,6 цэнтнера з гектара.

Па даных сортавыпрабавання за 1938 год, на сортаўчастках Гомельскай і Палескай абласцей азімае жыта «Новазыбкаўскае М-4» дало ўраджай 18,8 цэнтнера з гектара, а сорт «Вятка» — 12,8 цэнтнера.

Авёс сорту «Мінскі 92», выведзены на Беларускай селекцыйнай станцыі, па даных выпрабавання на сортаўчастках Мінскай зоны за 1938 год, даў ураджай 28 цэнтнераў з гектара, у той час як распаўсюджаны ў Беларусі сорт «Маскоўскі А-315» даў 20,9 цэнтнера.

Бульба сорту «Остботэ» ў 1945 годзе на Беларускай селекцыйнай станцыі дала ўраджай 328 цэнтнераў з гектара, а сорт № 1231-18, выведзены гэтай-жа станцыяй у гэтым-жа годзе, даў 446 цэнтнераў з гектара. У гэтых-жа ўмовах распаўсюджаны ў БССР стандартны сорт «Вольтман» даў ураджай у 271 цэнтнер з гектара.

Пасевы бульбы мясцовым несартавым насеннем у тых-жа ўмовах далі ўраджай у сярэднім па 184 цэнтнеры з гектара.

Насенневодства ў Беларусі пачало развівацца пасля калектывізацыі і асабліва шырока з 1937 года. К 1937 году па БССР сартавыя пасевы збожжавых культур складалі каля 25 процантаў ад агульнай пасеўнай плошчы.

У 1937 годзе, па рашэнню Соўнаркома СССР «Аб мерах па палепшанню насення збожжавых культур», у Беларускай ССР была створана сістэма насенневодства, якая складаецца з Беларускай селекцыйнай станцыі, 22 сортавыпрабавальных участкаў, 62 раённых насенневодчых гаспадарак (райнасенгасаў), сеткі Дзяржсортфонда і насенных участкаў у калгасах. У 1940 годзе пры Наркамземе БССР была створана дзяржаўная камісія па сортавыпрабаванню бульбы, гародных культур і кармовых корнеплодаў і 10 сортавыпрабавальных участкаў.

За гэтыя годы ў БССР была праведзена вялікая работа па палепшанню насенневодства збожжавых і іншых сельскагаспадарчых культур, у выніку чаго ўжо ў 1940 годзе сартавыя пасевы збожжавых культур дасягнулі 67,8 процанта, у

тым ліку пшаніцы да 97,1 працанта, ячменю—95,8, аўса—64,2, гароху—66,8 працанта. Сартавыя пасевы бульбы ў 1940 годзе складалі 45,1 працанта, ільну—99,9 працанта.

Была створана таксама сетка насенневодчых калгасаў па вырошчванню сартавога насення гародных культур і кармавых корнеплодаў з плошчай пасеву каля 1.500 гектараў.

За гады нямецка-фашысцкай акупацыі насенневодчая сетка і матэрыяльна-тэхнічная база селекцыйных станцый была разбурана, а фонд дэфіцытнага сартавога насення знішчан. Паводле даных апрабацыі сартавых пасеваў, праведзенай у 1945 годзе, выяўлена сартавых пасеваў збожжавых культур толькі 415,4 тысячы гектараў, што складае 36 працантаў да агульнай плошчы пасеву збожжавых, у тым ліку сартавых пасеваў яравых збожжавых 23 працанты. З 100 тысяч гектараў абследаванай бульбы выяўлена толькі 11 тысяч гектараў сартавых пасеваў. Якасць выяўленых сартавых пасеваў нізкая.

За 1944—1945 гг. у БССР у асноўным адноўлена дзейнасць усёй насенневодчай сістэмы.

Для далейшага палепшання і развіцця насенневодства сельскагаспадарчых культур у рэспубліцы неабходна правесці наступныя мерапрыемствы: значна павысіць увагу да райнасенгасаў, арганізацыйна і гаспадарча ўмацаваць іх; забяспечыць іх поўным наборам сельгасмашын, інвентара, транспартнымі сродкамі і мінеральнымі ўгнаеннямі; выдзеліць з МТС для абслугоўвання райнасенгасаў лепшыя трактары і лепшых трактарыстаў; укамплектаваць райнасенгасы аграномамі; рэгулярна забяспечваць элітным насенным матэрыялам.

Задача заключаецца ў тым, каб ператварыць усе райнасенгасы ў культурныя, узорныя гаспадаркі, рассаднікі перадавой агратэхнікі, праваднікі травапольнай сістэмы земляробства. У райнасенгасах павінны быць арганізаваны правільныя севазвароты з травасеяннем і чорнымі папарамі, а таксама ўведзена перадавая сістэма апрацоўкі глебы і догляду раслін. Насенневодчы калгас у раёне павінен быць узорам рацыянальнага і высокапрадуктыўнага вядзення калгаснай гаспадаркі.

Цэнтральнае звяно ў барацьбе за насенне—гэта насенныя ўчасткі калгасаў. У 1946 годзе трэба ажыццявіць у шырокім маштабе сістэму мерапрыемстваў, якая забяспечвае значнае павышэнне ўраджайнасці на насенных участках. Калгасы павінны забяспечыць на насенных участках высокаякаснае і своечасовае правядзенне ўсіх палявых работ. Пад насенныя ўчасткі трэба адвесці лепшыя зямельныя масівы, узараныя



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

пад зябліва і добра ўгноеныя; на працягу ўсяго вегетацыйнага перыяду неабходна ўстанавіць пастаянны нагляд за пасевамі.

Навукова-даследчыя ўстановы — інстытуты, селекцыйныя і вопытныя станцыі павінны шырока разгарнуць работу па вывядзенню новых сартоў збожжавых, тэхнічных, кармавых культур, корне- і клубнеплодаў; вывесці сарты ракаўстойлівай бульбы, стварыць новыя сарты зімастойкіх азімых культур; вывесці сарты, устойлівыя супроць сельскагаспадарчых шкоднікаў і хвароб—пыльнай галаўні, іржаўчыны і іншых.

У кожнай вобласці неабходна стварыць па адной добрай элітна-насенневодчай гаспадарцы па збожжавых культурах, якія наблізілі-б узнаўленне элітнага насення да райнасенгасаў.

Каб не затрачваць многа часу на арганізацыю гаспадаркі і служб, неабходна для гэтых гаспадарак адвесці ў кожнай вобласці па аднаму соўгасу. Такім чынам, кожная вобласць здолее вырошчваць і адказваць сама за забяспечанне райнасенгасаў элітным насеннем.

Неабходна аднавіць пры Наркамземе БССР камісію па сортавыпрабаванню бульбы, гародных культур і кармовых корнеплодаў, 10 сортавыпрабавальных пунктаў і арганізаваць узнаўленне насення эліты кармавых корнеплодаў; стварыць цвёрдую сетку насенневодчых гаспадарак па вырошчванню сартавога насення гароднінных культур і кармавых корнеплодаў.

Неабходна арганізаваць сортавыпрабавальныя ўчасткі па збожжавых культурах у заходніх абласцях БССР з уключэннем у сортавыпрабаванне селекцыйных сартоў і мясцовых высокаўраджайных сартоў, а таксама стварыць дзяржаўную селекцыйную станцыю па збожжавых культурах для абслугоўвання заходніх абласцей і ў ільнаводнай зоне БССР—селекцыйную станцыю па ільну.

Улічваючы асабліва важнае значэнне лубіну, як зялёнага ўгнаення і кармавой культуры, неабходна стварыць у рэспубліцы сетку насенневодчых гаспадарак па ўзнаўленню насення лубіну. Наркамат соўгасаў БССР таксама павінен паклапаціцца аб тым, каб некаторыя соўгасы прынялі насенневодчы ўхіл.

Пры балотных вопытных станцыях трэба арганізаваць аддзелы селекцыі і насенневодства сельскагаспадарчых культур для тарфяных глебаў.

Неабходна аднавіць існаваўшыя да вайны насенныя рас-

саднікі і сетку райнасенгасаў шматгадовых траў, а таксама аднавіць работу Турскай вопытнай сельскагаспадарчай станцыі па селекцыі траў.

Трэба прызнаць, што асноўным звяном у насенневодстве з'яўляюцца насенныя ўчасткі калгасаў. Таму неабходна, каб на вырошчванне насення на насенных участках звярнулі сур'ёзную ўвагу мясцовыя партыйныя, совецкія арганізацыі і зямельныя органы.

Нарэшце, трэба прыняць вельмі сур'ёзныя меры па ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскагаспадарчых навукова-даследчых насенневодчых устаноў БССР.

## РОЛЯ ЛЯСОЎ У ПАВЫШЭННІ УРАДЖАЙНАСЦІ ПАЛЁЎ БЕЛАРУСІ

Лес з'яўляецца нацыянальным багаццем Беларусі і карыстаецца любоўю і павагай усяго народа. У народзе кажуць: «Лес ды вада поле ўпрыгожваюць», «Каля лесу жыць—галаду не бачыць».

Лясы, дзякуючы сваім водаахоўным, водарэгуліруючым і глебаахоўным уласцівасцям, з'яўляюцца важным фактарам павышэння ўраджайнасці палёў. Лес мае выключнае значэнне ў стварэнні спрыяючага для раслін, а, значыць, і для ўраджаяў, воднага рэжыму тэрыторыі.

Лясы ахоўваюць рэкі ад абмялення, робяць больш роўнамерным і рэгулярным водны рэжым, ахоўваюць глебу ад змыву найбольш пладароднай часткі яе, прадухіляюць размыў глебы, ахоўваюць палі ад шкодных вятроў, ахоўваюць ворыўныя землі ад высыхання і выдування, ахоўваюць палі ад запясочвання. Цяжка пералічыць спрыяючыя ўласцівасці лясоў для земляробства, не гаворачы ўжо аб іх эканамічным, стратэгічным і культурным значэнні.

Да рэвалюцыі лясы належалі памешчыкам і капіталістам. Яны па-драпежніцку знішчалі іх, агаляючы цэлыя раёны. Вялікаму знішчэнню падвергліся лясы ў час нямецкай і польскай акупацыі 1918 — 1920 гг. і, нарэшце, велізарнаму і бяссэнснаму знішчэнню нашы лясы падвергліся ў час апошняй нямецка-фашысцкай акупацыі.

Да вайны рубка лесу на будаўнічыя і тэхналагічныя патрэбы праводзілася ў асноўным у аб'ёме гадавога прыросту, але ў цэнтральнай частцы Беларусі, паблізу чыгунак, вырубка была вышэй гадавога прыросту, а лесааднаўленчыя работы вельмі адставалі.



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У сувязі з указанымі вышэй прычынамі за апошнія 60 год плошчы, занятыя лесам, у рэспубліцы вельмі скараціліся. Калі гэты працэс скарачэння лясных плошчаў не будзе прыпынен, то праз 15—20 гадоў перад сельскай гаспадаркай Беларусі паўстане сур'ёзнейшая пагроза зніжэння пладароднасці глебы, звязаная са зменай кліматычных умоў. Гэта велізарнае пытанне дзяржаўнага значэння ва ўмовах Беларусі.

Ужо цяпер у рэспубліцы ёсць раёны, у якіх лясы поўнасцю або ў большасці выраблены. У гэтых раёнах рэзка знізіліся ўраджайнасць палёў і ўзровень жывёлагадоўлі.

У БССР выпадае ў сярэднім столькі атмасферных ападкаў у год, што ў поўнай меры забяспечвае вырошчванне высокіх ураджаяў, для атрымання якіх, згодна даных навукі, дастаткова ў сярэднім каля 450 міліметраў. Аднак каля чвэрці гадавых ападкаў выпадае зімою ў выглядзе снягоў. У бязлесных раёнах вясной снегатаянне праходзіць у 3 — 4 дні; вада сходзіць хутка, зносіць найбольш каштоўны ворыўны пласт зямлі, размывае глебу, утвараючы аўрагі; адбываецца паглыбленне рачных далін, што, у сваю чаргу, вядзе да зніжэння ўзроўню грунтовых вод і пазбаўляе, такім чынам, другой крыніцы забяспечання раслін вадой. У раёнах Беларусі, пазбаўленых лесу, адбываецца працэс заляочвання глебаў.

З гэтага вынікае зусім ясны і бясспрэчны вывад: калі мы хочам узняць узровень земляробства, калі мы не хочам жыць толькі сённяшнім днём, а заглянем у будучае, то мы павінны не толькі спыніць далейшае зніжэнне лясістасці, а, наадварот, безумоўна забяспечыць павелічэнне яе. Гэта, вядома, не значыць, што мы павінны адмовіцца ад рубкі лесу. Трэба весці рубку ў межах, задавальняючых народную гаспадарку, адначасова шляхам сур'ёзных лесааднаўленчых работ дабіцца прыроднага прыросту лясоў. Чым больш мы будзем аднаўляць лясы, тым больш будзем мець магчымасцей нарыхтоўваць драўніну, не выходзячы з межаў гадавога прыросту.

Значыць, задача заключаецца ў тым каб:

а) паставіць у шырокіх маштабах лесааднаўленне ў дзяржаўных лясах. Гэта асноўная задача ў рабоце органаў лесаахоўы і лесанасаджэнняў. Усе мясцовыя арганізацыі, калгасы і калгаснікі павінны дапамагчы гэтаму;

б) правесці поўнае лесааднаўленне ў лясах, перададзеных калгасам, гарадам, соўгасам і сялянам заходніх абласцей. Такіх лясоў у рэспубліцы 840.000 гектараў. У гэтых лясах існаваў такі парадак, што рубілі ўсе, каму патрэбна была драў-

ніна, а лесааднаўленнем ніхто не займаўся. З падобнай безгаспадарчай практыкай, безумоўна, трэба пакончыць;

в) па ўсёй рэспубліцы ўцягнуць у лесаводства і лесааднаўленне ўсе калгасы, усе гаспадаркі. Трэба стварыць гадавальнікі, стварыць такія ўмовы, каб кожны калгас на працягу бліжэйшых гадоў правёў аблясенне ўсіх зямель калгасаў, непрыгодных для сельскагаспадарчага скарыстання, дабіваючыся ўкаранення хуткарастучых парод дрэў. Тое-ж самае адносіцца да сядзіб калгаснікаў, аднаасобнікаў, да школ, больніц і г. д. Усюды лесанасаджэнням павінен быць наданы вялікі размах і значэнне. Такія насаджэнні лесу, раскіданыя сярод сельскагаспадарчых угоддзяў, будуць мець велізарнае значэнне, як водаахоўныя і глебаахоўныя ачагі, палосы, якія маюць станоўчы ўплыў на павышэнне ўраджайнасці;

г) навесці строгі дзяржаўны парадак у лесаэксплаатацыі, прыцягваючы да найстражэйшай адказнасці за няправільныя, драпежніцкія, тармозячыя лесааднаўленне спосабы рубкі. Практыкаваць спосабы рубак, якія найбольш садзейнічаюць прыроднаму аднаўленню лясоў. Трэба высока паставіць культуру догляду і зберажэння лясоў і насаджэнняў. Народная мудрасць гаворыць, што «Без расчысткі і лес не расце», «Не берагчы параснік—не відаць і дрэва», «Лес па дрэву не плача—па парасніку сохне»;

д) усюды, дзе толькі ёсць магчымасці, трэба скараціць або зусім спыніць нерацыянальнае спажыванне драўніны. Неабходна ў гэтую пяцігодку дабіцца амаль поўнага спынення спажывання драўніны ў кацельнях прамысловасці, пераводу гэтых кацельняў на торф. Развіццём торфабрыкетнай вытворчасці скараціць спажыванне дроў у гарадах.

Важнейшае значэнне для захавання лясоў будзе мець ажыццяўленне прынятага намі плана развіцця вытворчасці цэглы і чарапіцы і спажыванне іх як асноўных матэрыялаў у сельскім будаўніцтве.

Такім чынам, лесааднаўленне і лесаразвядзенне павінна ўваходзіць абавязковым элементам у агульны план арганізацыі сельскагаспадарчай тэрыторыі кожнага раёна. Лесааднаўленчым работам трэба надаць сур'ёзнейшае значэнне.

## АБ МТС І ЦЯГЛАВАЙ СІЛЕ КАЛГАСАЎ

Нямецка-фашысцкія захопнікі нанеслі велізарныя страты машынна-трактарным станцыям і калгаснаму пагалоўю коней. Яны знішчылі ўсе машынна-трактарныя станцыі, майстэрні і трактары.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Я ўжо гаварыў, што пасля вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў у калгасах засталося не больш 25 процантаў рабочых коней, прычым сярод іх было многа хворых і наогул непрацаздольных. Сярэдняя колькасць коней, якая прыпадала на адзін калгас у 1944 годзе, была ўтрая менш, чым да вайны. Больш 4.000 калгасаў мелі толькі ад 2 да 10 коней. З такой колькасцю коней, пры адсутнасці трактарнага парка ў МТС, калгасы вызваленых летам 1944 года абласцей БССР уступілі ў асеннюю сяўбу. Не гледзячы на велізарныя цяжкасці, калгаснікі працавалі самааддана. Азімы клін быў засеян у размеры 69 процантаў да даваеннага плана.

У зіму 1944—1945 гг. была праведзена велізарная работа па аднаўленню МТС і трактарнага парка. Было адноўлена 320 МТС і ў іх 1.268 трактараў. У рэспубліку было завезена 2.169 трактараў.

Вясной 1945 года трактары выканалі 18 процантаў сельскагаспадарчых работ.

У 1945 годзе машынна-трактарныя станцыі Беларусі дабіліся вялікіх поспехаў. ЦК КП(б)Б і Соўнарком Беларусі, улічваючы добрую работу МТС, у сярэдзіне года папрасілі Саюзны ўрад павялічыць план трактарных работ па Беларусі на 250 тысяч гектараў. Машынна-трактарныя станцыі і гэты павялічаны план трактарных работ перавыканалі.

Многія машынна-трактарныя станцыі дабіліся выдатных вынікаў, передавыя трактарысты вышлі на ўзровень усесаюзных дасягненняў. У цэлым рабочыя, трактарысты, механікі, інжынерна-тэхнічны і кіруючы персанал машынна-трактарных станцый Беларусі паказалі бліскучы ўзор высокай соцыялістычнай прадукцыйнасці працы.

Не гледзячы на гэтыя поспехі, удзельная вага МТС у сельскагаспадарчых работах 1945 года склала ўсяго 23 проценты, у той час як у 1940 годзе яна склала 57,9 процанта.

Не гледзячы на тое, што за 1945 год конскае пагалоўе павялічылася на 70 тысяч коней, усё-ж становішча з цяглавай сілай у калгасах прадаўжала заставацца вельмі цяжкім. Нагрузка на каня ў сельскай гаспадарцы складала 24,5 гектара, у той час як да вайны яна складала 8,2 гектара. Апрача таго, конь выконвае велізарную работу па-за сельскай гаспадаркай.

Уздым сельскай гаспадаркі немагчым без аднаўлення цяглавай сілы калгасаў.

Якія-ж шляхі і магчымасці павелічэння конскага пагалоўя? Неабходна, перш за ўсё, рашуча змяніць адносіны да каня.

Вядомы выпадкі зусім дзікіх, нецярпімых адносін да коней, што прывяло да падзяжу іх.

Прыходзіцца прызнаць, што многія нашы партыйныя, совецкія, зямельныя работнікі і старшыні калгасаў не даюць палітычнай ацэнкі гэтай акалічнасці, абыякава глядзяць на факты злачынных адносін да коней.

Неабходна ва ўсіх калгасах стварыць нармальныя ўмовы ўтрымання коней. Падзеж кожнага каня павінен разглядацца, як надзвычайнае здарэнне, неадкладна расследавацца ў афіцыяльным парадку, і віноўныя павінны прыцягвацца да найстражэйшай судовай адказнасці.

Якія ёсць магчымасці скарачэння нагрузкі на каня? Гэтыя магчымасці наступныя:

а) трэба павялічыць процант механізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Апрача завозу трактараў з заводаў Совецкага Саюза, неабходна ўсямерна фарсіраваць будаўніцтва Мінскага трактарнага завода з такім разлікам, каб ён як мага хутчэй выпускаў трактары;

б) неабходна паступова скарачаць удзел коней на лесавывазках. Гэта задача павінна быць вырашана шырокім будаўніцтвам вузкакалейных чыгунак. Вывазка аднаго кубаметра лесу па вузкакалейцы ў 5 разоў дзешавей вывазкі гужам;

в) скараціць нагрузку на каня шляхам шырокага скарыстання рэк і каналаў Беларусі для перавозак грузаў.

У нас ёсць велізарная колькасць рэк, але па транспартнаму скарыстанню іх мы стаім на апошнім месцы ў Совецкім Саюзе. Яшчэ ў старадаўнія часы праз Беларусь праходзіў славуты шлях — з варяг у грэкі. У старадаўнія часы людзі скарыстоўвалі працякаючыя па Беларусі рэкі для міжнародных сувязей і далёкіх перавозак, а ў наш час, у век, як гаворыцца, пары і электрычнасці, нашы рэкі недастаткова скарыстоўваюцца.

Нашы раёны і калгасы, якія знаходзяцца ля рэк, павінны завесці свой малатанажны флот.

Нарэшце, самі калгасы павінны знайсці спосабы больш прадукцыйнага скарыстання коней. Напрыклад, калгаснікам патрэбна многа торфу для паліва і для ўгнаення. Замест таго, каб гэты груз вазіць на конях, мэтазгодней было б да тарфянога масіва пракласці вузкакалейку, па якой і дастаўляць торф. Вузкакалейка можа быць скарыстана для вывазкі гною і іншых угнаенняў. Для пабудовы вузкакалейкі можна прымяніць рэйкі і ваганеткі з дрэва.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

ЦК ВКП(б) і Савецкі ўрад удзяляюць вялікую ўвагу развіццю конегадоўлі. Мы абавязаны ўсямерна развіваць гэтую важнейшую галіну народнай гаспадаркі. Неабходна сур'ёзнейшым чынам паставіць справу ўзнаўлення конепагалоўя, узорна праводзіць злучную кампанію, догляд жарэбных коне-матак, ветэрынарную дапамогу і догляд маладняка. Трэба развіць у калгасах конетаварныя фермы і ўтварыць у рэспубліцы сетку дзяржаўных канюшняў і конезаводаў.

Трэба вырошчваць рабочых валоў. Гэта добрая цяглавая сіла. У 1945 годзе ў Беларусі ўдзельнічалі ў палявых работах 7.653 рабочыя валы. У веснавой сяўбе 1946 года павінны ўдзельнічаць звыш 20.000 рабочых валоў. У калгасах вырошчваецца 60 тысяч кастрыраваных бычкоў, частка з іх, каля 25 тысяч, ужо будзе ўключана ў асеннія палявыя работы 1946 года.

Такім чынам, мы павінны атрымаць значную падмогу да наяўнага ў калгасах цягла і здолеем значна аблягчыць становішча каня. У тых раёнах, дзе надалі сур'ёзнае значэнне вырошчванню бычкоў, ёсць нядрэнныя вынікі. Так, напрыклад, у Хойніцкім раёне, Палескай вобласці, у 1945 годзе працавала 458 бычкоў, у 1946 годзе будзе працаваць 1.346; у Нараўлянскім раёне ёсць 1.200 рабочых валоў і вырошчваецца 1.300 бычкоў; у Ельскім раёне працуе 235 валоў і ў 1946 годзе будзе працаваць 790.

Вырошчванню бычкоў, як спосабу хутчэйшага атрымання цяглавай сілы, павінна быць надана вялікае значэнне.

## АБ ВЫТВОРЧАСЦІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ МАШЫН І ІНВЕНТАРА

Важнейшым пытаннем калгаснай вытворчасці з'яўляецца забяспечанне калгасаў і аднаасобных гаспадарак рэспублікі сельскагаспадарчымі машынамі, інвентаром, абозам і да т. п.

Недахоп сельскагаспадарчых машын і інвентара вядзе да непрадукцыйных затрат велізарнай колькасці ручной працы і пагаршае культуру сельскагаспадарчай вытворчасці. Наяўнымі жнеяркамі можна ўбраць толькі 120 тысяч гектараў, або каля 10 працэнтаў збожжавых культур. Малатарні МТС і калгасаў забяспечваюць абмалот з плошчы 1.200 тысяч гектараў. Астатнія 300 тысяч гектараў павінны быць абмалочаны ўручную. Больш палавіны калгасаў не маюць магчымасці рабіць нармальную ачыстку насення з-за адсутнасці трыераў, сартыровак і іншых зернеачышчальных машын. Адчуваецца

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

вострьі недахват глебаапрацоўчага інвентара, а таксама прасцейшага сельскагаспадарчага інвентара і інструментаў.

Папаўненне парка сельскагаспадарчых машын — важнейшая ўмова аднаўлення сельскагаспадарчай вытворчасці і павышэння ўраджаяў. Трэба адзначыць, што даваенная вытворчасць сельскагаспадарчых машын, прылад і інвентара ў Беларусі была развіта зусім недастаткова, і, не гледзячы на параўнаўча вялікі завоз іх, калгасы ўсходніх абласцей і аднаасобныя гаспадаркі заходніх абласцей рэспублікі адчувалі недахоп у некаторых машынах і інвентары.

Велізарная патрэбнасць у сельскагаспадарчых машынах, інвентары, абозе, шорных вырабах, запасных частках, а таксама калёснай мазі, кавальскім вугалі павінна задавальняцца не толькі за кошт завозу ў рэспубліку з іншых абласцей краіны, але і за кошт арганізацыі вытворчасці на месцы — на прадпрыемствах мясцовай прамысловасці, промкааперацыі і непасрэдна ў калгасах.

Для гэтага неабходна ажыццявіць наступныя мерапрыемствы:

1. Значна развіць вытворчасць сельскагаспадарчых машын на Лідскім, Валкавыскім, Гомельскім і іншых заводах за кошт расшырэння вытворчых плошчаў, завозу абсталявання, палепшання тэхналагічнага працэсу.

2. Значна паскорыць аднаўленчыя работы на Гомсельмашы, арганізаваўшы масавы выпуск прадукцыі ўжо ў бягучым годзе.

3. Перавесці на выпуск сельгасмашын і інвентара некалькі заводаў Наркоммясцпрома і промкааперацыі для штогоднага выпуску конных плугоў да 25 тысяч, барон — 10 — 15 тысяч, конных культыватараў — 3 — 5 тысяч, сартыровак і веялак— 4—5 тысяч, а таксама трактарных культыватараў, лушчыльнікаў і лугабалотнага інвентара, патрэбнасць у якім будзе штогод павялічвацца.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы